ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 4 (863) | Субота, 26 студзеня 1952 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

Перадавы. — Аб мастацкай крытыцы.

Ленін жыве ў нашых сэрцах і справах.

У Камітэце па міжнародных Сталінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі». Уручэнне міжнароднай Сталінскай прэміі бразільскаму пісьменніку Жоржы Амаду.

Другая старонка.

АБ XXVIII ГАДАВІНЕ З ДНЯ СМЕРЦІ В. І. ЛЕНІНА. Даклад тав. П. Н. Паспелава на ўрачыста-жалобным паседжанні ў Маскве.

Трэцяя старонка.

М. Садковіч. — Тэкст у дакументальным кінафільме.

М. Клімковіч. — Твор пра барацьбу за мір.

П. Герасімовіч. — Новыя творы ў карціннай галерэі.

А. Солаў. — Завочнікі індустрыяльнага інстытута.

Чацвертая старонка.

М. Лынькоў. — У дэмакратычнай Польшчы. Павысіць узровень музычнай творчасці.

Я. Брыль. — Мы іх віталі, як родных.

Ул. Стэльмах. — Безуважнасць да рэжысуры.

А. Шатроў. — Абласная выстаўка самадзейнага мастацтва.

Аб мастацкай крытыцы

Кожны год мастацтва Совецкай Беларусі ўзбагачаецца новымі спектаклямі, карцінамі, скульптурамі, фільмамі, творамі музыкі. Іх слухаюць, глядзяць дзесяткі тысяч людзей і паглыбляюць на гэтых творах свой светапогляд, мастацкі густ.

У гэтым працэсе духоўнага росту народа вялікая і высакародная місія ляжыць на мастацкай крытыцы. Крытык — бліжэйшы дарадчык гледача і мастака. Кожная тэатральная рэцэнзія, рэцэнзіі на кінафільмы, музычныя творы, кожнае выступленне па пытаннях мастацтва, змешчаныя ў друку, сустракаюць шырокую зацікаўленасць чытачоў. Вось чаму партыя і народ ставяць перад крытыкай задачу велізарнай важнасці: глыбока і тэарэтычна абгрунтавана аналізаваць мастацкія творы.

Ці спраўляецца наша мастацкая крытыка з гэтымі задачамі? Далёка недастаткова. Многія творы мастацтва наогул застаюцца па-за ўвагай крытыкі. За мінулыя два гады, напрыклад, беларускія мастакі напісалі больш двухсот карцін, стварылі нямала скульптур. У друку-ж аб іх з'явілася пяць-шэсць артыкулаў, якія па сутнасці ўяўлялі сабой інфармацыі.

Яшчэ горш абстаіць справа ў музычнай крытыцы. Пры Саюзе кампазітараў існуе секцыя музыказнаўцаў, але налічвае яна толькі шэсць чалавек, ды і тыя вельмі рэдка выступаюць з рэцэнзіямі і артыкуламі.

Адносна больш актыўная дзейнасць наглядаецца ў тэатральнай крытыцы. Амаль кожны спектакль у пастаноўцы тэатраў БССР мае даволі шырокую крытычную ацэнку. На спектаклі мінскіх тэатраў у друку з'яўляецца па некалькі рэцэнзій на кожны. Абласныя газеты таксама адгукаюцца амаль на кожную пастаноўку перыферыйных тэатраў. Пры рэдакцыях абласных газет выраслі кадры тэатральных рэцэнзентаў, якія сістэматычна выступаюць з ацэнкамі спектакляў. Так, на старонках абласных газет даволі часта выступаюць у якасці рэцэнзентаў тт. Сурскі, Бухарцаў (Брэст), Аграноўскі, Сакольскі (Пінск), Дняпроў, Ільіна, Лінёў (Гродна) і другія. Многія іх рэцэнзіі вызначаюцца ўменнем данесці да чытача ідэйную сутнасць спектакля, творчую задуму аўтара і ўвасабленне яе на сцэне.

У рэспубліканскіх газетах і часопісах тэатральная крытыка займае большае месца ў параўнанні з крытычнымі выступленнямі па другіх відах мастацтва. Імёны тэатральных крытыкаў Ул. Няфёда, Я. Рэмановіча, Ул. Стэльмаха, А. Бутакова і другіх вядомы работнікам тэатральнага мастацтва.

Разам з тым і тэатральная крытыка не можа яшчэ задаволіць патрабаванняў грамадскасці. Вельмі часта яшчэ друкуюцца стандартныя, абыякавыя рэцэнзіі і артыкулы, у тым ліку і за подпісамі вышэйназваных крытыкаў, у якіх глыбокі творчы аналіз падмяняецца агульнымі характарыстыкамі накшталт таго, што такі-та актор «справіўся са сваёй роляй», у другога «менш удалося», адзін выконвае сваю ролю «з вялікай выразнасцю», другі «мала выразна» і г. д. У кожнай рэцэнзіі можна знайсці ацэнку: «спектакль хвалюе», або «не хвалюе» і вельмі рэдка аўтар даказвае, **чым-жа і чаму** спектакль хвалюе або не хвалюе. А іменна ў гэтым і заключаецца сэнс і сутнасць мастацкага аналізу.

Газета «Правда» ў артыкуле «Аб тэатральных рэцэнзіях» пісала: «Разглядаючы ігру актораў, рэцэнзенты іншы раз не выяўляюць ведання жыцця, ведання тэатра. Ім даводзіцца адпісвацца бяздоказнымі заўвагамі агульнага характару і ў розных варыянтах, якія да таго-ж бясконца паўтараюцца».

Такая характарыстыка цалкам адносіцца да многіх тэатральных рэцэнзій, якія друкуюцца і ў нашай газеце, якім нестае страснасці, усхваляванасці, а самае галоўнае — тэарэтычнай глыбіні.

Тэарэтычны ўзровень работ мастацтвазнаўцаў, музыказнаўцаў і тэатральных крытыкаў невысокі. Гэта адна з галоўнейшых прычын адставання беларускай мастацкай крытыкі. Крытыка ў большасці выпадкаў носіць каментатарскі характар, а жыццё патрабуе глыбокіх тэарэтычных і філасофскіх абагульненняў, абгрунтавання сваіх ацэнак і поглядаў на мастацтва. Характэрным прыкладам такой каментатарскай крытыкі было нядаўняе абмеркаванне рэспубліканскай мастацкай выстаўкі. Замест таго, каб на аснове твораў беларускіх мастакоў і скульптараў паставіць рад творчых праблемных пытанняў, дакладчык П. Герасімовіч па сутнасці пракаментыраваў дзесяткі два карцін. Па такому-ж прынцыпу былі пабудаваны амаль усе выступленні па дакладу. Абмеркаванне прайшло на нізкім тэарэтычным узроўні, без глыбокага вывучэння творчага вопыту ўсяго совецкага выяўленчага мастацтва.

Нашым крытыкам неабходна выступаць з праблемнымі, тэарэтычнымі працамі, якія абагульнялі-б творчы вопыт не толькі беларускага, але і ўсяго совецкага мастацтва. Далейшы ідэйны і тэарэтычны рост беларускай мастацкай крытыкі патрабуе сур'ёзнай дапамогі з боку творчых арганізацый, якія яшчэ вельмі мала цікавяцца гэтым.

Мастацтвазнаўцы П. Герасімовіч і І. Элентух напісалі крытычныя работы аб мастаках Я. Зайцаву і О. Марыксу, а Н. Туроўнікаў і С. Кацар падрыхтавалі нарыс аб беларускім выяўленчым мастацтве. Але Саюз мастакоў не зацікавіўся гэтымі работамі, не абмеркаваў іх. За пасляваенныя гады Дзяржаўнае выдавецтва БССР не выпусціла ніводнай манаграфіі аб дзеячах беларускага мастацтва, ніводнай крытычнай працы па мастацтву.

Яшчэ да нядаўняга часу тэатральныя крытыкі фармальна ўваходзілі ў секцыю крытыкі пры ССП, хоць ніхто імі там не цікавіўся і не кіраваў іх працай. Зараз яны перайшлі ў секцыю драматургіі, дзе, нарэшце, на іх трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу. Побач з п'есамі ў секцыі трэба абмяркоўваць і работы тэатральных крытыкаў, патрабуючы ад іх большавіцкай прынцыповасці, ідэйнай і тэарэтычнай глыбіні, майстэрства.

Цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных музыказнаўцаў павінна стаць Беларуская дзяржаўная кансерваторыя, але там бездаказна ставяцца да агульнатэарэтычнай падрыхтоўкі сваіх кадраў, да авалодвання імі марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Вялікую дапамогу крытыцы аказваюць і ў далейшым могуць аказаць майстры мастацтва. На старонках друку пачалі часцей выступаць віднейшыя дзеячы беларускага мастацтва. З цікавымі артыкуламі выступаюць майстры сцэны Л. Александроўская, Д. Арлоў, О. Галіна, А. Кістаў, І. Ждановіч, А. Скібнеўскі, П. Малчанаў, кампазітары А. Багатыроў, Я. Цікоцкі, мастак А. Бембель і другія. Яны паставілі цэлы рад творчых задач, якія хвалююць мастацкую грамадскасць. І крытыкам ёсць чаму павучыцца на выступленнях майстроў мастацтва.

Няма сумнення, што грамадскасць рэспублікі дапаможа росту мастацкай крытыкі, але і самі крытыкі павінны рэзка павысіць патрабавальнасць да саміх сябе.

Калі актор, рэжысёр ці мастак у першую чаргу павінны адчуваць адказнасць за сваю творчасць перад гледачом, дык крытык нясе такую адказнасць і перад гледачом і перад вялікай арміяй работнікаў мастацтва.

Крытык—не фіксатар і каментатар падзей мастацтва, а палымяны прапагандыст яго большавіцкіх ідэй і лепшых вобразаў.

В. І. Ленін і І. В. Сталін абмяркоўваюць план ГОЭЛРО.
З карціны мастака **Д. А. Налбандзяна.**

Ленін жыве ў нашых сэрцах і справах

У гэтыя дні, калі народы Совецкага Саюза і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва шырока адзначалі жалобную дату — дваццаць восьмую гадавіну з дня смерці генія чалавецтва Владзіміра Ільіча Леніна, яшчэ раз з асаблівай сілай і пераканаўчасцю праявілася неўміручасць і таржаство ідэй ленінізма, глыбокая жыццёвасць і пераўтваральная роля вучэння Леніна.

Многа краін і народаў на зямным шары, многа розных моваў у чалавецтва, але для ўсіх народаў, на ўсіх мовах адпаўкава зразумела і хвалююча гучыць імя Леніна. Усім гэтае імя, як сонца, асвятляе шлях да свабоды і шчасця. Гісторыя з новай сілай пацвярджае выдатныя словы Владзіміра Маякоўскага:

Вечно будет ленинское сердце
клокотать
у революции в груди.

Памяці геніяльнага правадыра рэвалюцыі, заснавальніка комуністычнай партыі і першай у свеце Совецкай дзяржавы, мудрага настаўніка працоўных усяго свету былі прысвечаны ўрачыста-жалобныя паседжанні і сходы, якія адбыліся ва ўсіх гарадах, на прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах Совецкага Саюза. Урачыста-жалобныя сходы прайшлі ў краінах народнай дэмакратыі і ў іншых замежных краінах.

21 студзеня ў Маскве, у Дзяржаўным Акадэмічным Вялікім тэатры Саюза ССР адбылося ўрачыста-жалобнае паседжанне ЦК ВКП(б), МК і МГК ВКП(б), Прэзідыумаў Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета РСФСР, Маскоўскага абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных, ЦК ВЛКСМ, МК і МГК ВЛКСМ, Прэзідыума ВЦСПС сумесна з прадстаўнікамі партыйных, грамадскіх арганізацый і Совецкай Арміі.

18 гадзін 50 мінут. У прэзідыуме паяўляюцца таварыш І. В. Сталін, таварышы В. М. Молатаў, Г. М. Маленкоў, Л. П. Берыя, К. Е. Варашылаў, А. І. Мікаян, Н. А. Булганін, Л. М. Каганановіч, А. А. Андрэеў, Н. С. Хрушчоў, Н. М. Швернік, М. А. Суслаў, П. К. Панамарэнка, М. Ф. Шкіратаў.

Прысутныя стоячы горача вітаюць геніяльнага правадыра справы Леніна—правадыра і настаўніка ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва таварыша І. В. Сталіна. У зале ўзнікае бурная авацыя.

Старшынствуючы Н. М. Швернік гаворыць кароткае ўступнае слова і прапануе ўшанаваць памяць Владзіміра Ільіча Леніна ўставаннем. Усе ў глыбокім маўчанні ўстаюць. Тав. Н. М. Швернік гаворыць аб ажыццяўленні геніяльных ідэй Леніна, аб перамогах совецкага народа ў будаўніцтве комунізма, атрыманых пад кіраўніцтвам таварыша І. В. Сталіна.

Урачыста-жалобнае паседжанне аб'яўляецца адкрытым.

Слова для даклада тав. Н. М. Швернік прадастаўляе дырэктару Інстытута Маркса — Энгельса — Леніна тав. П. Н. Паспелаву.

— 28 год мінула з таго жалобнага дня, — гаворыць тав. Паспелаў, — калі адышоў ад нас Владзімір Ільіч Ленін, найвялікшы геній чалавецтва, любімы правадыр, бацька і настаўнік працоўных усяго свету.

Неўміручае вучэнне Леніна, якое развівае вялікі прадаўжальнік яго справы таварыш Сталін, валодае цяпер розумамі і сэрцамі працоўнага чалавецтва, указвае чалавецтву шлях вызвалення ад акоў капіталізма, шлях абнаўлення свету на аснове соцыялізма. Ленінізм — марксізм эпохі імперыялізма і пролетарскіх рэволюцый — з кожным годам усё больш пацвярджае сваю вялікую, усеперамагаючую сілу, служыць верным компасам і маяком для ўсіх будаўнікоў соцыялізма і комунізма, для ўсіх барацьбітоў супраць імперыялізма, супраць капіталістычнага рабства.

Совецкія людзі, кіруемыя вялікай партыяй Леніна—Сталіна, дабіліся сусветнагістарычных перамог соцыялізма таму, што яны змагаліся і перамагалі ворагаў, унутраных і знешніх, будавалі новае жыццё па Ільічу, следуючы бессмяротным заветам Леніна.

Залогам непераможнасці комуністычнай партыі і совецкага народа з'яўляецца тое, што яны ва ўсім следуюць заветам Леніна, што яны ва ўсёй сваёй дзейнасці кіруюцца мудрымі ўказаннямі вялікага прадаўжальніка справы Леніна — таварыша Сталіна!

Дакладчык гаворыць аб таржастве ідэй ленінізма. Яны натхняюць совецкіх людзей на гераічныя працоўныя подзвігі, натхняюць і клічуць да барацьбы і да новых перамог, умацоўваюць упэўненасць у канчатковым таржастве комунізма.

— Вялікія ідэі Леніна і Сталіна даходзяць да працоўных самых аддаленых куткоў зямнога шара, — гаворыць у заключэнне дакладчык. — Ніякія перашкоды і забароны не могуць перашкодзіць непераможнаму шэсцю перадавых ідэй сучаснасці, ідэй ленінізма па ўсяму свету.

Няхай жыве ленінізм — усеперамагаючы сцяг вызвалення чалавецтва!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна — «розум, чэсць і сумленне нашай эпохі»!

Няхай жыве непераможны совецкі народ!

Пад сцягам Леніна, пад вадзіцельствам Сталіна — уперад, да новых перамог комунізма!

Заключныя словы прамоўцы сустракаюцца бурнымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі. Усе ўстаюць. Раздаюцца воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Вялікаму Сталіну — слава!», «Таварышу Сталіну — ура!», «Любімаму правадыру і настаўніку, таварышу Сталіну — ура!»

Прысутныя спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал». Зноў раздаюцца бурныя апладысменты і воклічы ў чэсць вялікага прадаўжальніка справы Леніна—таварыша І. В. Сталіна.

* * *

21 студзеня ў Беларускім Дзяржаўным ордэна Леніна Вялікім тэатры оперы і балета адбылося ўрачыста-жалобнае паседжанне ЦК КП(б)Б, Мінскага абкома і гаркома КП(б)Б, Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, Мінскага абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных, ЦК ЛКСМБ, Мінскага абкома і гаркома комсамола, прэзідыума Рэспубліканскага Совета прафсаюзаў разам з прадстаўнікамі партыйных, грамадскіх арганізацый і Совецкай Арміі, прысвечанае 28-й гадавіне з дня смерці Владзіміра Ільіча Леніна.

У зале паседжання — дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, Героі Совецкага Саюза і Героі Соцыялістычнай Працы, стаханаўцы прамысловасці і транспарту, прадстаўнікі навукі, літаратуры, мастацтва, ваеннаслужачыя.

За сталом прэзідыума — таварышы Н. С. Патолічаў, А. Я. Кляшчоў, М. В. Зімянін, К. С. Цімашэнка, П. А. Абрасімаў, Ц. С. Гарбуноў, І. П. Ганенка і другія.

Адкрываючы паседжанне, сакратар ЦК КП(б)Б тав. М. В. Зімянін прапанаваў ушанаваць памяць Владзіміра Ільіча Леніна ўставаннем. Усе ўстаюць. Жалобная цішыня.

Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты ўдзельнікі паседжання выбіраюць у ганаровы прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з вялікім прадаўжальнікам неўміручай справы Леніна — таварышам Сталіным.

З дакладам «28 год без Леніна, пад вадзіцельствам таварыша Сталіна, па ленінскаму шляху» выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. І. П. Ганенка.

З велізарным уздымам прысутныя прынялі прывітальнае пісьмо вялікаму правадыру працоўных Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Урачыста-жалобнае паседжанне закончылася спяваннем партыйнага гімна «Інтэрнацыянала».

* * *

Найярчэйшым прыкладам усё больш глыбокага пранікнення ідэй ленінізма ў мільённыя народныя масы з'яўляецца бурны рост выдання геніяльных ленінскіх прац, якія вучаць працоўных, як трэба будаваць сваё шчасце, перамагаць ворагаў.

Гісторыя яшчэ не ведала такіх вялікіх тыражоў кніг, такога бурнага пашырэння іх па ўсіх краінах свету, як гэтага дасягнула выданне твораў класікаў марксізма-ленінізма.

У Совецкім Саюзе тыраж твораў В. І. Леніна дасягнуў 222.360 тысяч экземпляраў. Збор Твораў Леніна выдаецца на адзінаццаці мовах народаў нашай краіны. Закончана выданне на рускай, украінскай, беларускай і латышскай мовах.

Творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна выдаюцца масавымі тыражамі ў краінах народнай дэмакратыі. У Польшчы за апошнія шэсць з паловай год тыраж твораў Леніна дасягнуў 7,5 мільёна экземпляраў, у народнай рэспубліцы Балгарыі збор Твораў Леніна дасягне 700 тысяч экземпляраў. У Кітайскай Народнай Рэспубліцы толькі ў 1950 годзе асобныя працы Леніна выдадзены тыражом у 764 тысячы экземпляраў.

Ленінізм — сцяг мільёнаў, іх сонца і светлая надзея.

У Камітэце па міжнародных Сталінскіх прэміях „За ўмацаванне міру паміж народамі"

Уручэнне міжнароднай Сталінскай прэміі бразільскаму пісьменніку Жоржы Амаду

У Крэмлі, у Свердлоўскай зале, адбылося ўручэнне міжнароднай Сталінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» вядомаму бразільскаму пісьменніку, актыўнаму барацьбіту за захаванне і ўмацаванне міру — Жоржы Амаду.

К 2 гадзінам дня ў зале сабраліся шматлікія прадстаўнікі совецкіх грамадскіх арганізацый—Совецкага камітэта абароны міру, Саюза совецкіх пісьменнікаў, Антыфашысцкага камітэта совецкіх жанчын, Антыфашысцкага камітэта совецкай моладзі, прафсаюзаў. Сярод прысутных—відныя вучоныя, пісьменнікі, дзеячы совецкага мастацтва, наватары вытворчасці.

Паяўленне ў зале Жоржы Амаду было сустрэта прысутнымі працяглымі апладысментамі.

Пасля зачытання пастановы Камітэта па міжнародных Сталінскіх прэміях старшыня Камітэта акадэмік Д. В. Скабельцын уручае Жоржы Амаду дыплом лаўрэата міжнароднай Сталінскай прэміі і залаты нагрудны медаль.

Акадэмік Д. В. Скабельцын у кароткай прамове віншуе Жоржы Амаду з высокай узнагародай.

Прымаючы прэмію, Жоржы Амаду гаворыць усхваляваную прамову, выслуханую прысутнымі з вялікай увагай.

З прывітальнымі прамовамі выступілі таксама старшыня Совецкага камітэта абароны міру Н. С. Ціханаў, сакратар праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў А. В. Сафронаў і намеснік старшыні Антыфашысцкага камітэта совецкай моладзі К. П. Арлоў, якія горача павіншавалі лаўрэата.

За тыдзень

Вершы, прысвечаныя В. І. Леніну

Камітэт радыёінфармацыі пры Совеце Міністраў БССР правёў тэматычную перадачу «Ленін жыве паміж нас».

Перад мікрафонам выступалі народны паэт БССР Якуб Колас, паэты Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Пятрусь Броўка, Пімен Панчанка, Кастусь Кірэенка, Рыгор Няхай і другія з чытаннем вершаў, прысвечаных вялікаму генію чалавецтва Владзіміру Ільічу Леніну.

Праведзена некалькі тэматычных перадач з твораў пісьменнікаў Совецкага Саюза і прагрэсіўных пісьменнікаў свету, прысвечаных Владзіміру Ільічу.

Лекцыя-канцэрт

У Мінскім акруговым Доме афіцэраў імя Маршала Совецкага Саюза К. Варашылава адбылася лекцыя-канцэрт на тэму: «Вобраз Владзіміра Ільіча Леніна ў мастацкай літаратуры і музычных творах совецкіх кампазітараў». У лекцыі-канцэрце прымалі ўдзел лепшыя артыстычныя сілы нашай сталіцы. Да гэтай лекцыі-канцэрта ў бібліятэцы Дома афіцэраў арганізавана спецыяльна кніжная выстаўка.

Каляровы фільм «Совецкая Беларусь»

У кінастудыі «Беларусьфільм» адбыўся грамадскі прагляд дакументальнага фільма «Совецкая Беларусь» вытворчасці студыі «Беларусьфільм» (рэжысёр Корш-Саблін). Фільм расказвае аб выдатных поспехах беларускага народа ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, дасягнутых пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, паказвае прыродныя багацці нашай краіны, здраўжэнне гарадоў і калгасных вёсак рэспублікі і новыя фабрыкі і заводы, пабудаваныя ў пасляваенныя гады пры дапамозе ўсіх народаў Совецкага Саюза.

На грамадскім праглядзе фільма прысутнічалі пісьменнікі, кампазітары, мастакі і дзеячы мастацтва, а таксама работнікі друку.

Новы спектакль тэатра імя Я. Купалы

Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр імя Янкі Купалы паказаў новы спектакль «На досвітку» па п'есе А. Макаёнка (пастаноўка К. Саннікава, рэжысёр Ус. Кухта, мастацкае афармленне І. Ушакова, музыка Я. Цікоцкага).

У спектаклі выступілі: народны артыст СССР і БССР Г. Глебаў, народныя артысты рэспублікі О. Галіна-Александроўская, Ул. Дзядзюшка, заслужаныя артысты рэспублікі Б. Кудраўцаў, С. Станюта, Л. Шынко, Э. Шапко, С. Бірыла, Б. Ямпольскі, П. Іваноў, артысты З. Браварская, В. Краўцоў і другія.

Канферэнцыя па пытаннях мовазнаўства

25 студзеня ў вялікай канферэнц-зале Акадэміі навук БССР адкрылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная пытанням сучаснага беларускага правапісу ў святле сталінскага вучэння аб мове.

Канферэнцыю адкрыў віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук народны паэт БССР Якуб Колас.

На ранішнім паседжанні заслуханы даклад дырэктара Інстытута мовазнаўства АН СССР акадэміка В. В. Вінаградава «Задачы совецкай навукі ў галіне мовы ў святле прац таварыша І. В. Сталіна па пытаннях мовазнаўства» і даклад дырэктара Інстытута мовазнаўства АН БССР правадзейнага члена АН БССР Кандрата Крапівы.

Пасля дакладаў разгарнуліся спрэчкі.

Нарада армейскіх літаратараў

Учора ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў адкрылася нарада маладых літаратараў Беларускай ваеннай акругі.

У рабоце нарады прымаюць удзел пісьменнікі Міхась Клімковіч, Максім Лужанін, Макар Паслядовіч, Міхась Калачынскі, Алесь Бачыла, Пятро Прыходзька, Алесь Кучар, Уладзімір Шахавец, Алесь Есакоў.

АБ XXVIII ГАДАВІНЕ З ДНЯ СМЕРЦІ В. І. ЛЕНІНА

Даклад тав. П. Н. ПАСПЕЛАВА на ўрачыста-жалобным паседжанні ў Маскве

28 год мінула з таго жалобнага дня, калі адышоў ад нас Владзімір Ільіч Ленін, найвялікшы геній чалавецтва, любімы правадыр, бацька і настаўнік працоўных усяго свету.

Неўміручае вучэнне Леніна, якое развівае вялікі прадаўжальнік яго справы таварыш Сталін, валодае цяпер розумамі і сэрцамі працоўнага чалавецтва, указвае чалавецтву шлях вызвалення ад акоў капіталізма, шлях абнаўлення свету на аснове соцыялізма. Ленінізм — марксізм эпохі імперыялізма і пролетарскіх рэволюцый, — з кожным годам усё больш пацвярджае сваю вялікую, усеперамагаючую сілу, служыць верным компасам і маяком для ўсіх будаўнікоў соцыялізма і комунізма, для ўсіх барацьбітоў супраць імперыялізма, супраць капіталістычнага рабства.

У першую гадавіну смерці В. І. Леніна таварыш Сталін пісаў:

«Памятайце, любіце, вывучайце Ільіча, нашага настаўніка, нашага правадыра.

Змагайцеся і перамагайце ворагаў, унутраных і знешніх, — па Ільічу.

Будуйце новае жыццё, новы быт, новую культуру, — па Ільічу.

Ніколі не адмаўляйцеся ад малога ў рабоце, бо з малога будуецца вялікае, — у гэтым адзін з важных заветаў Ільіча».

Совецкія людзі, кіруемыя вялікай партыяй Леніна — Сталіна, дабіліся сусветна-гістарычных перамог соцыялізма таму, што яны змагаліся і перамагалі ворагаў, унутраных і знешніх, будавалі новае жыццё па Ільічу, следуючы бессмяротным заветам Леніна.

Залогам непераможнасці комуністычнай партыі і совецкага народа з'яўляецца тое, што яны ва ўсім следуюць заветам Леніна, што яны ва ўсёй сваёй дзейнасці кіруюцца мудрымі ўказаннямі вялікага прадаўжальніка справы Леніна—таварыша Сталіна! **(Працяглыя апладысменты).**

I. Марксісцкая партыя новага тыпу— вялікая пераўтвараючая сіла грамадства

Многія гады Ленін і Сталін вялі барацьбу супраць апартуністаў, за стварэнне рэволюцыйнай марксісцкай партыі новага тыпу, якая прынцыпова адрознівалася-б ад старых, рэфармісцкіх партый II Інтэрнацыянала, барацьбу за стварэнне такой партыі, якая была-б здольна павесці пролетарыят на заваяванне ўлады, здольна ажыццявіць абнаўленне свету на аснове соцыялізма.

Гэтымі днямі, 18 студзеня 1952 года, споўнілася 40 год з дня важнейшай падзеі ў жыцці нашай партыі—Пражскай канферэнцыі 1912 года, якая выгнала здрадніка-меншавікоў з партыі рабочага класа і аформіла самастойнае існаванне большэвіцкай партыі, паклала пачатак рэволюцыйнай марксісцкай партыі **новага** тыпу, партыі ленінізма.

Калі разразілася першая сусветная вайна, рэфармісцкія партыі II Інтэрнацыянала, палітычна разложаныя апартуністычнымі лідэрамі, агентамі буржуазіі ў рабочым руху, — здрадзілі справе міжнароднай салідарнасці рабочых, пачалі падтрымліваць імперыялістычную вайну пад ілжывымі лозунгамі «абароны айчыны», а на самай справе ў імя карыслівых, грабежніцкіх інтарэсаў імперыялістаў.

Толькі большэвіцкая партыя, рэволюцыйная марксісцкая партыя **новага** тыпу, выратавала сцяг міжнароднай салідарнасці рабочых, выступіла супраць імперыялістычнай вайны, за звяржэнне імперыялістычных урадаў, за рэволюцыйны выхад з імперыялістычнай вайны.

У гады вайны партыя Леніна—Сталіна ідэйна ўзбройваецца ленінскім вучэннем аб войнах справядлівых і несправядлівых, аб шляхах барацьбы супраць імперыялістычнай вайны. Партыя ўзбройваецца геніяльным ленінскім вучэннем аб магчымасці перамогі соцыялізма спачатку ў нямногіх або нават у адной, асобна ўзятай капіталістычнай краіне.

У адзін з самых цяжкіх момантаў у гісторыі нашай партыі, пасля ліпеньскіх дзён 1917 года, калі партыя падвяргалася жорсткім праследванням з боку імперыялістычнага ўрада Керэнскага, у тыя дні Ленін, скрываючыся ў падполлі, натхнёна пісаў аб партыі большэвікоў: «Ёй мы верым, у ёй мы бачым розум, чэсць і сумленне нашай эпохі» (В. І. Ленін. Творы, том 25, стар. 239).

У эпоху імперыялізма, калі ахопленыя палітычным шаленствам і людаедскай прагай ваенных звышпрыбыткаў мільярдэры і мільянеры асудзілі народы на імперыялістычныя войны, на неапісальныя бедствы і пакуты,—у комуністычнай партыі бачыў Ленін **розум** нашай эпохі. У комуністычнай партыі бачыў Ленін тую вялікую сілу, якая можа ўказаць народам шлях, як пакончыць з імперыялістычнымі войнамі, можа натхніць народы на гэтую барацьбу.

У эпоху імперыялізма, калі паміраючы і загніваючы капіталізм ідзе на самыя бессаромныя і зверскія злачынствы, каб утрымаць парахнеючую ўладу капіталістычных рабаўладальнікаў, калі самі паняцці аб чэсці і сумленні аб'яўляюцца імперыялістамі непатрэбнай «хімерай», у комуністычнай партыі бачыў Ленін непадкупнае **сумленне** нашай эпохі, вялікую сілу, якая выратоўвае жыццё, чэсць і свабоду народаў.

У 1917 годзе Ленін і Сталін бачылі, што ланцуг імперыялізма можа быць хутчэй за ўсё прарван у Расіі. Таму правадыры рэволюцыі Ленін і Сталін упэўнена павялі партыю і рабочы клас да перамогі соцыялістычнай рэволюцыі пад лозунгам «Уся ўлада Советам!». Партыя большэвікоў здолела выкрыць у вачах народа памешчыцкія, капіталістычныя партыі (чорнасоценцаў, кадэтаў), дробнабуржуазныя, згодніцкія партыі (эсэраў, меншавікоў і інш.), якія сталі абаронцамі капіталістаў і памешчыкаў, прыслужнікамі імперыялістаў. Партыя Леніна—Сталіна заваявала давер'е большасці народа і прышла да ўлады таму, што яна выступіла на справе як адзіная антыпамешчыцкая, антыкапіталістычная партыя, як адзіная партыя, здольная пакончыць з імперыялістычнай вайной, з панаваннем капіталістаў і памешчыкаў, забяспечыць сапраўдную народную ўладу.

«Мы, партыя большэвікоў, Расію **пераканалі.** Мы Расію **адвялі**—у багатых для бедных, у эксплуататараў для працоўных», — пісаў Ленін у пачатку 1918 года (В. І. Ленін. Творы, том 27, стар. 214).

У сваім гістарычным выступленні 26 кастрычніка 1917 года, абгрунтоўваючым дэкрэт аб міры, Ленін даў геніяльнае вызначэнне таго, у чым заключаецца непераможная сіла маладой пролетарскай дзяржавы—у свядомасці мас. Ленін паказаў, як прынцыпова адрозніваецца наша паняцце аб сіле ад буржуазнага ўяўлення аб сіле.

«Сіла, па буржуазнаму ўяўленню, гэта тады, калі масы ідуць слепа на бойню, падпарадкоўваючыся ўказцы імперыялістычных урадаў,—гаварыў Ленін.—Буржуазія толькі тады прызнае дзяржаву моцнай, калі яна можа ўсёй магутнасцю ўрадавага апарата кінуць масы туды, куды хочуць буржуазныя правіцелі. Наша паняцце аб сіле іншае. Па нашаму ўяўленню дзяржава моцная свядомасцю мас. Яна моцная тады, калі масы ўсё ведаюць, аб усім могуць меркаваць і ідуць на ўсё свядома» (В. І. Ленін. Творы, том 26, стар. 224).

Уся гісторыя Совецкай дзяржавы, створанай геніем Леніна, паказвае, што яна моцная свядомасцю мас, якія з найвялікшай стойкасцю абараняюць сваю соцыялістычную айчыну.

«Мы — абаронцы цяпер, з 25 кастрычніка 1917 г., мы — за абарону айчыны з гэтага дня. Бо мы даказалі на справе наш разрыў з імперыялізмам», — указваў Ленін (В. І. Ленін. Творы, том 27, стар. 42).

Грамадзянская вайна, навязаная нам разбітымі рэволюцыяй класамі памешчыкаў і капіталістаў і імперыялістычнымі дзяржавамі, якія пачалі ўзброеную інтэрвенцыю супраць нашай краіны, закончылася перамогай совецкага народа. Пацярпелі крах планы амерыкана-англійска-французскіх і іншых імперыялістаў, планы гувераў і уркартаў, што марылі аб раздзеле і закабаленні Расіі. Совецкі народ выгнаў са сваёй тэрыторыі іншаземных акупантаў, якія прычынілі нашаму народу цяжкія, незабыўныя пакуты і велізарныя матэрыяльныя страты.

Совецкая Рэспубліка атрымала перамогу над полчышчамі інтэрвентаў і белагвардзейцаў таму, што кіруючым ядром тылу і фронта Чырвонай Арміі была партыя Леніна — Сталіна, моцная сваім адзінствам і згуртаванасцю, непераўзыйдзеная сваім уменнем арганізаваць мільённыя масы.

«Калі Расія ўстаяла перад напорам сусветнага імперыялізма,—гаварыў таварыш Сталін у 1921 годзе, — калі яна атрымала на знешніх франтах рад сур'ёзнейшых поспехаў, калі яна на працягу двух — трох год развіла з сябе сілу, патрасаючую асновы сусветнага імперыялізма, то гэтым яна абавязана, між іншым, той згуртаванай, загартаванай у баях і выкаванай з цвёрдай сталі комуністычнай партыі, якая ніколі не ганялася за колькасцю сваіх членаў і першымі сваімі клопатамі лічыла палепшанне іх якаснага састава» (І. В. Сталін. Творы, том 5, стар. 99).

Совецкая дзяржава ўжо ў першыя гады свайго існавання паказала велізарную маральна-палітычную сілу, трываласць і ўстойлівасць, хоць у тэхніка-эканамічных адносінах наша краіна была тады яшчэ адсталай і слабай у параўнанні з больш магутнымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Падводзячы вынікі пройдзенага партыяй і Совецкай дзяржавай шляху, Ленін гаварыў на XI з'ездзе партыі:

«...тое, што заваявана рускай рэволюцыяй,—з'яўляецца неад'емным. Гэтага ніякая сіла не можа ўзяць, як ніякая сіла ў свеце не можа ўзяць назад таго, што Совецкай дзяржавай было створана. Гэта — сусветна-гістарычная перамога» (В. І. Ленін. Творы, том 33, стар. 270).

У сваёй апошняй прамове на пленуме Маскоўскага Совета Ленін з найвялікшай упэўненасцю гаварыў аб тым, што «социялізм ужо цяпер не ёсць пытанне аддаленага будучага», што наша партыя здолее прывесці народ да перамогі соцыялізма.

Партыя паспяхова ажыццявіла пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна такі круты паварот у сваёй палітыцы, як пераход ад палітыкі «ваеннага комунізма» да новай эканамічнай палітыкі, да палітыкі выкарыстання рыначных адносін, разлічанай на ўмацаванне саюза рабочых і сялян, на выцясненне капіталістычных элементаў і пабудову фундамента соцыялістычнай эканомікі.

Збыліся прадказанні вялікага Леніна, выкананы яго заветы аб пабудове соцыялістычнага грамадства. Комуністычная партыя, пад мудрым кіраўніцтвам таварыша Сталіна, адстаяла заветы Леніна ад усіх атак ворагаў ленінізма, здолела натхніць совецкі народ вялікімі мэтамі пабудовы соцыялістычнага грамадства ў нашай краіне, разграміла ўсіх ворагаў соцыялізма, іх спробы сарваць справу соцыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, прывяла нашу краіну да перамогі соцыялізма. У небывала кароткі гістарычны тэрмін, за гады сталінскіх пяцігодак, наша краіна на аснове совецкага ладу і вялікага працоўнага ўздыму народных мас ліквідавала сваю тэхніка-эканамічную і культурную адсталасць, з адсталай аграрнай краіны стала магутнай індустрыяльна-калгаснай соцыялістычнай дзяржавай.

Нязмерна ўзросшы тэхніка-эканамічны патэнцыял краіны соцыялізма ў спалучэнні з непераможнай маральна-палітычнай сілай совецкага народа далі магчымасць не толькі ўстаяць перад вераломным нападам гітлераўскай Германіі, якая мела ў сваім распараджэнні тэхніку і эканоміку ўсёй акупіраванай Еўропы, але і разграміць фашысцкую Германію і імперыялістычную Японію, вызваліць народы Еўропы ад фашысцкага ярма. Можна смела сказаць, што толькі Совецкая дзяржава, моцная свядомасцю мас і маральна-палітычным адзінствам народа, толькі совецкія патрыёты, кіруемыя партыяй Леніна — Сталіна, маглі вытрымаць небывала цяжкія выпрабаванні ў першы перыяд вайны і дабіцца поўнай перамогі над злейшым ворагам чалавецтва — нямецкім фашызмам.

Сусветна-гістарычная перамога Совецкага Саюза над фашысцкай Германіяй і імперыялістычнай Японіяй дала магчымасць народам раду краін Еўропы і Азіі ўзяць свой лёс у свае ўласныя рукі, аблягчыла перамогу ладу народнай дэмакратыі ў радзе краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, аблягчыла перамогу вялікай народнай рэволюцыі ў Кітаі. Карэнным чынам змянілася ўся міжнародная абстаноўка. Утварыўся магутны лагер міру, соцыялізма і дэмакратыі. Змяніліся суадносіны сіл паміж капіталістычнай і соцыялістычнай сістэмамі. Рушыла ўперад справа абнаўлення свету на аснове дэмакратыі і соцыялізма.

Совецкі народ і ўсё перадавое чалавецтва заўсёды будуць удзячны вялікаму натхняцелю і арганізатару ўсіх нашых перамог таварышу Сталіну, палітычны, арганізатарскі і стратэгічны геній якога выратаваў будучыню чалавецтва! **(Працяглыя, бурныя апладысменты).**

Ва ўсёй сваёй дзейнасці па рэволюцыйнаму пераўтварэнню грамадства марксісцкая партыя новага тыпу кіруецца навукова-пазнанымі законамі развіцця грамадства, вялікай навукай марксізма-ленінізма. У гэтым велізарная перавага нашай партыі і брацкіх комуністычных і рабочых партый перад усімі буржуазнымі і дробнабуржуазнымі, згодніцкімі партыямі.

«Толькі наша партыя ведае, куды весці справу, і вядзе яе ўперад з поспехам, — указвае таварыш Сталін. — Чаму абавязана наша партыя гэтай сваёй перавагай? Таму, што яна з'яўляецца партыяй марксісцкай, партыяй ленінскай. Яна абавязана таму, што кіруецца ў сваёй рабоце вучэннем Маркса, Энгельса, Леніна. Не можа быць сумнення, што пакуль мы застаемся вернымі гэтаму вучэнню, пакуль мы валодаем гэтым компасам, — будзем мець поспехі ў сваёй рабоце», — вучыць таварыш Сталін (І. В. Сталін. Творы, том 13, стар. 377).

Увесь ход гісторыі пацвердзіў і пацвярджае словы Леніна аб тым, што большэвізм указаў верны шлях да выратавання ад жахаў вайны і імперыялізма. Вялікім гістарычным вопытам і прыкладам партыі Леніна — Сталіна кіруюцца брацкія комуністычныя партыі, якія ажыццяўляюць справу абнаўлення свету на аснове соцыялізма.

II. Партыя Леніна—Сталіна вядзе совецкі народ да комунізма

Мы жывем у вялікую сталінскую эпоху завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комунізма.

«Ад капіталізма, — пісаў Ленін у сваім артыкуле «Задачы пролетарыята ў нашай рэволюцыі», — чалавецтва можа перайсці непасрэдна толькі да соцыялізма, г. зн. агульнага ўладання сродкамі вытворчасці і размеркавання прадуктаў па меры работы кожнага. Наша партыя глядзіць далей: соцыялізм непазбежна павінен паступова перарасці ў комунізм, на сцягу якога значыцца: «кожны па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях» (В. І. Ленін. Творы, том 24, стар. 62).

Ленін указваў, што для пераходу да комунізма трэба перавесці ўсю гаспадарку краіны на самую перадавую тэхнічную базу.

«Комунізм — гэта ёсць Совецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны», — неаднаразова ўказваў Ленін.

Ленін гаварыў, што «комунізм ёсць вышэйшая, супраць капіталістычнай, прадукцыйнасць працы добраахвотных, свядомых, аб'яднаных, скарыстоўваючых перадавую тэхніку, рабочых» (В. І. Ленін. Творы, том 29, стар. 394).

Ленін указваў, што для паступовага пераходу да комунізма неабходны наступныя асноўныя ўмовы:

а) дасягнение вышэйшай прадукцыйнасці працы на базе новай, вышэйшай тэхнікі і ў прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы, на базе няспыннага росту прадукцыйных сіл;

б) выхаванне комуністычнай свядомасці, выхаванне новага чалавека, для якога праца ператварылася-б у «першую жыццёвую патрэбнасць».

Таварыш Сталін развіў далей ленінскую тэорыю аб магчымасці пабудовы **социялізма ў адной краіне,** зрабіў геніяльны тэарэтычны вывад аб магчымасці пабудовы комунізма ў нашай краіне і ў тым выпадку, калі захаваецца капіталістычнае акружэнне. Гэты вывад даў партыі і совецкаму народу вялікую перспектыву барацьбы за перамогу комунізма.

Увесь совецкі народ з велізарным творчым уздымам узводзіць вялікія сталінскія будоўлі комунізма, магутныя гідраэлектрастанцыі, гіганцкія арашальныя каналы. Вялікія будоўлі комунізма ў спалучэнні з паспяхова выконваемым планам пераўтварэння прыроды з'яўляюцца адным з важнейшых звеньняў у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы комунізма. Адкрываюцца новыя крыніцы памнажэння грамадскага багацця, жыццёвых выгод, багацця прадуктаў харчавання, адзення ў нашай краіне. Рэзка зменшыцца залежнасць сельскай гаспадаркі ад капрызаў прыроды, будаўнікі комунізма ўсё больш будуць падпарадкоўваць сабе прыроду. Збываецца вядомае прадраканне Энгельса аб тым, што людзі, якія сталі гаспадарамі свайго грамадскага быцця, «становяцца ў выніку гэтага гаспадарамі прыроды».

У эпоху будаўніцтва комунізма ўсё больш узрастае ўзброенасць прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту, будаўніцтва новай, вышэйшай тэхнікай, якая дае магчымасць механізаваць працаёмкія працэсы вытворчасці, аблягчыць працу і забяспечыць няспынны рост прадукцыйнасці працы.

Пры буржуазным ладзе прымяненне машын абмежавана карыслівымі меркаваннямі капіталіста, які прымяняе машыну толькі тады, калі гэта абяцае павелічэнне прыбытку. Пры соцыялізме, асабліва ў эпоху паступовага перарастання соцыялізма ў комунізм, усё больш узрастае роля машын і новай тэхнікі. Збываецца прадраканне Маркса аб тым, што «ў комуністычным грамадстве машыны знайшлі-б зусім іншую арэну, чым у буржуазным грамадстве» («Капітал», том 1, стар. 399, выд. 1951 года).

Уменне ўладаць складанейшымі механізмамі і перадавымі метадамі работы, барацьба за высокую культуру вытворчасці, уменне прымяняць у вытворчасці навуку і тэхнічныя веды, творчая ініцыятыва, клопаты аб паскарэнні тэмпаў вытворчасці пры высокай якасці прадукцыі, барацьба за эканомію сыравіны, электраэнергіі, паліва, матэрыялаў — вось характэрныя рысы соцыялістычнага спаборніцтва на сучасным этапе. Будаўнікі комунізма памятаюць і выконваюць адзін з важных заветаў Леніна, указаны таварышам Сталіным, — ніколі не адмаўляцца ад малога ў рабоце, «бо з малога будуецца вялікае». Сэканомленыя мінуты і секунды, сэканомленыя грамы і кілаграмы сыравіны і матэрыялаў, памнажаючыся на велізарныя маштабы нашых прадпрыемстваў і нашай краіны, вырастаюць у буйныя велічыні, у сотні тысяч і мільёны.

Комуністычнае выхаванне працоўных — важнейшая задача ў барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства. Добрасумленная работа кожнага совецкага чалавека па сваіх здольнасцях з'яўляецца адной з самых важных умоў для паступовага пераходу да комуністычнага грамадства, калі для кожнага члена грамадства праца зробіцца першай жыццёвай патрэбнасцю, калі на аснове вырасшай свядомасці і поўнага багацця жыццёвых даброт можна будзе паступова перайсці да размеркавання па патрэбнасці.

Абавязковая ўмова паспяховага руху совецкага народа да комунізма — далейшае развіццё і ўмацаванне грамадскай соцыялістычнай уласнасці, барацьба з перажыткамі капіталізма. Комуністычная партыя і Совецкая дзяржава выхоўваюць у совецкіх людзей беражлівыя адносіны да грамадскай соцыялістычнай уласнасці, нястомна змагаюцца з безгаспадарчасцю, марнатраўствам, неахайнымі і злачыннымі адносінамі да грамадскай уласнасці, з рознымі антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі.

Совецкі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна паспяхова будуе комуністычнае грамадства. Важным крокам на шляху стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы комунізма з'явілася датэрміновае выкананне плана першай пасляваеннай пяцігодкі, якое мае велізарнае міжнароднае значэнне.

Дасягненні народаў Совецкага Саюза, якія паспяхова выканалі план пасляваеннай пяцігодкі і атрымалі ў 1951 годзе ад новых выдатных перамог на фронце будаўніцтва комунізма, не толькі павялічылі магутнасць сіл міру і дэмакратыі на ўсім свеце, але і адкрылі перад народамі ўсіх краін перспектывы светлай будучыні.

Мы можам цяпер сказаць, што комунізм ужо не ёсць пытанне аддаленага будучага, што ён расце і будзе расці з вялікай творчай працы совецкіх людзей, з новых поспехаў нашай навукі і тэхнікі, з няспыннага росту прадукцыйнасці працы і павышэння матэрыяльна-культурнага ўзроўню жыцця совецкіх людзей.

Калі ўжо соцыялістычная сістэма даказала сваю бясспрэчную перавагу перад капіталістычнай сістэмай, то тым больш наглядна і відавочна будзе перавага перад капіталістычным ладам вырастаючага паступова з соцыялізма комуністычнага грамадства.

III. Соцыялізм і дэмакратыя непераможны

Калі нараджалася і ўмацоўвалася маладая Совецкая рэспубліка, у студзені 1918 года, на трэцім Усерасійскім з'ездзе Советаў Ленін гаварыў, што пачаўшыйся рух народаў да соцыялізма, рух, у авангардзе якога ідзе рускі рабочы клас, — непераможны.

«Наша соцыялістычная рэспубліка Советаў,—указваў Ленін,—будзе стаяць моцна, як факел міжнароднага соцыялізма і як прыклад перад усімі працоўнымі масамі. Там — бойка, вайна, крывапраліцце, ахвяры мільёнаў людзей, эксплуатацыя капітала, тут — сапраўдная палітыка міру і соцыялістычная рэспубліка Советаў» (В. І. Ленін. Творы, том 26, стар. 429).

Ніколі яшчэ не быў так відавочны вялікі кантраст, супрацьлегласць двух светаў — свету паміраючага і загніваючага капіталізма, які штурхае чалавецтва ў бездань новых знішчальных войн, і свету соцыялізма, які паказаў сваю непераадольную жыццёвую сілу, які вядзе паслядоўную ленінска-сталінскую палітыку міру і з'яўляецца адзінай надзеяй чалавецтва.

У лагеры капіталізма — шалёная гонка ўзбраенняў, бязглуздая растрата прадукцыйных сіл, людаедскія заклікі да новай вайны, пропаведзь звярынага «закона джунгляў», імперыялістычнай «палітыкі сілы», пропаведзь разбою, смерці і знішчання. У лагеры капіталізма — нечуванае ўзмацненне капіталістычнай эксплуатацыі, нацыянальнага прыгнёту, распальванне расавай і нацыянальнай варожасці, адраджэнне фашызма, няспыннае пагоршанне становішча працоўных у сувязі з палітыкай гонкі ўзбраенняў, ростам цэн і інфляцыяй.

Нават у буржуазным амерыканскім друку пачынаюць раздавацца галасы, якія асуджаюць вар'яцкую, бессаромную і бесчалавечную сістэму ператварэння вайны ў «бізнес», у выгадную справу, у сродак шалёнай нажывы і штучнага падтрымання загніваючай капіталістычнай эканомікі.

Гэтымі днямі ў правінцыяльнай амерыканскай газеце «Ньюс» было надрукавана пісьмо адстаўнога генерала амерыканскай арміі Холдрыджа, які выкрыў ілжывую прапаганду амерыканскага друку і заявіў: «Вайна—гэта бізнес Амерыкі. «Канцэрн забойстваў» стаў нашым галоўным прадпрыемствам, у якое мы ўкладваем 100 мільярдаў даляраў штогод. Калі-б мы раптам страцілі гэтую крыніцу прыбыткаў, наша эканоміка рухнула-б за адзін дзень».

Такія прызнанні пачынаюць паяўляцца ў амерыканскім друку.

У лагеры соцыялізма і дэмакратыі — сапраўдная палітыка міру і барацьба за мір, адсутнасць людзей і груп, зацікаўленых у вайне, бурны рост прадукцыйных сіл, палітыка раўнапраўя і дружбы народаў, вялікія будоўлі, пераўтвараючыя прыроду, пафас мірнай, стваральнай працы. У лагеры соцыялізма—няспыннае палепшанне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця працоўных, няспынны рух уперад на аснове брацкай узаемадапамогі ўсіх краін і народаў, уваходзячых у лагер соцыялізма і дэмакратыі. Вялікія перавагі соцыялістычнага шляху развіцця пацвярджаюцца цяпер не толькі гістарычным вопытам Совецкага Саюза, але і вопытам краін народнай дэмакратыі.

Ленін гаварыў у 1922 годзе аб тым, што капіталістычныя ўрады ацэньвалі імперыялістычную вайну «з пункту гледжання таго, што ляжыць у іх пад носам», не разумеючы таго, да якіх вынікаў прыводзяць супярэчнасці і пакуты вайны.

«Мы, комуністы,—указваў Ленін,—гаварылі, што мы вайну ацэньваем больш глыбока і больш правільна, што супярэчнасці і бядоты яе дзейнічаюць нязмерна шырэй, чым мяркуюць капіталістычныя дзяржавы. І, гледзячы з боку на буржуазныя краіны-пераможцы, мы гаварылі: памянуць яны нашы прадказанні і нашу ацэнку вайны і яе вынікаў яшчэ не аднойчы» (В. І. Ленін. Творы, т. 33, стар. 188—189).

У 1926 годзе, калі міжнародная буржуазія пачынала падрыхтоўваць ужо другую сусветную вайну, таварыш Сталін прадказваў і папярэджваў, што другая спроба перадзелу свету «абыйдзецца сусветнаму капіталізму многа даражэй, чым першая» (І. В. Сталін. Творы, том 9, стар. 108).

Гісторыя пацвердзіла геніяльнае прадбачанне таварыша Сталіна. Калі ў выніку першай сусветнай вайны і Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі ад сістэмы капіталізма адпала каля 140 мільёнаў чалавек, адна шостая частка зямнога шара, разгарнуўся агульны крызіс капіталізма, то ў выніку другой сусветнай вайны і перамогі соцыялізма над фашызмам ад капіталістычнай сістэмы адпала ўжо больш 800 мільёнаў чалавек, утварыўся вялікі лагер міру, соцыялізма і дэмакратыі.

Узнік небывалы яшчэ ў гісторыі магутны, ахапляючы ўсе народы і краіны, арганізаваны рух прыхільнікаў міру, які перашкаджае імперыялістам абвітаць хлуснёй народы і ўцягнуць іх у вайну.

«Мір будзе захаван і ўмацаван, — вучыць таварыш Сталін, — калі народы возьмуць справу захавання міру ў свае рукі і будуць адстойваць яе да канца».

Мудрыя словы таварыша Сталіна натхнілі народы на яшчэ больш актыўную барацьбу за захаванне міру. 600 мільёнаў подпісаў пад Зваротам аб заключэнні Пакта Міру паміж пяцёю вялікімі дзяржавамі выражаюць адзінадушную волю народаў да міру і з'яўляюцца сур'ёзным папярэджаннем падпальшчыкам вайны.

Агульны крызіс капіталізма ў выніку другой сусветнай вайны ўступіў у новы этап і бясспрэчна будзе ўсё больш абвастрацца і паглыбляцца. Растуць супярэчнасці ў лагеры імперыялістаў. З асаблівай сілай абвастрыўся ў цяперашні перыяд крызіс усёй каланіяльнай сістэмы імперыялізма. Да актыўнага палітычнага жыцця і барацьбы ўзняліся і ўзнімаюцца сотні мільёнаў народаў Азіі, якія складаюць большасць насельніцтва зямлі.

Прабуджэнне народаў Азіі сведчыць аб таржастве творчага марксізма, таржастве ленінска-сталінскай тэорыі соцыялістычнай рэволюцыі. «Соцыялістычная рэволюцыя, — вучыў Ленін, — не будзе толькі і галоўным чынам барацьбой рэволюцыйных пролетарыяў у кожнай краіне супраць сваёй буржуазіі, — не, яна будзе барацьбой усіх прыгнечаных імперыялізмам калоній і краін, усіх залежных краін супраць міжнароднага імперыялізма» (В. І. Ленін. Творы, том 30, стар. 138).

У краінах Азіі разгортваецца гіганцкая антыфеадальная і антыімперыялістычная рэволюцыя, якая апракідвае планы і разлікі амерыкана-англійскіх імперыялістычных заправіл.

Нават некаторыя прадстаўнікі амерыканскіх правячых кругоў вымушаны прызнаць са скрыгатам зубоў, што сучасны імперыялізм не можа зноў загнаць пад ярмо імперыялістычнай эксплуатацыі народы Азіі, якія прабудзіліся, што ніякая сіла не можа ўжо спыніць гэтыя народы.

«Хто сее вецер, пажне буру». На працягу стагоддзяў каланіяльныя капіталістычныя дзяржавы сеялі нездавальненне народаў Азіі сваёй грабежніцкай, прыгнятальніцкай палітыкай. Цяпер яны пажынаюць буры і навальніцы. Англійскі журналіст Р. Пейн нядаўна выпусціў у Нью-Йорку кнігу «Чырвоная навальніца над Азіяй». У гэтай кнізе ён прызнае крах каланіяльнай палітыкі імперыялістычных дзяржаў, у першую чаргу ЗША, прызнаецца, што падавіць магутны нацыянальна-вызваленчы рух народаў Азіі сілай ужо немагчыма. «Мы павінны ўсвядоміць усю глыбіню змяненняў, якія адбыліся ў Азіі за мінулыя пяць год; здаецца, быццам праімчаліся цэлыя стагоддзі рэволюцыйных бур...» — заяўляе Пейн. «У даны час, — робіць невясёлы вывад гэты буржуазны журналіст, — бясспэчна мець надзею, што паток удасца запрудзіць або што армії здолеюць павярнуць яго назад».

Ленін гаварыў аб небывалым паскарэнні тэмпаў сусветна-гістарычнага развіцця ў сувязі з тым, што актыўны ўдзел у гістарычным працэсе пачынаюць прымаць сотні мільёнаў раней адсталых і прыгнечаных народаў, якія складаюць гіганцкую большасць насельніцтва зямлі. Ленін гаварыў на гэтай падставе, што «канчатко-

(Заканчэнне на 3 стар.).

АБ XXVIII ГАДАВІНЕ З ДНЯ СМЕРЦІ В. І. ЛЕНІНА

Даклад П. Н. ПАСПЕЛАВА на ўрачыста-жалобным паседжанні ў Маскве

(Заканчэнне)

вая перамога соцыялізма ў поўнай меры безумоўна забяспечана» (Творы, том 33, стар. 458).

Міжнародны імперыялізм можа яшчэ прынесці велізарныя няшчасці і пакуты народам, але павярнуць назад кола гісторыі ён ужо не можа.

Калі амерыкана-англійскія імперыялісты адважацца развязаць трэцюю сусветную вайну, то яна абыйдзецца сусветнаму капіталізму яшчэ даражэй, чым дзве папярэднія сусветныя войны, яна можа толькі паскорыць гібель сусветнага капіталізма.

* * *

Совецкі народ упэўнена будуе комуністычнае грамадства таму, што яго творчая, кіпучая дзейнасць асветлена яркім святлом неўміручага вучэння ленінізма. Вялікія ідэі Леніна — Сталіна натхняюць совецкіх людзей на гераічныя працоўныя подзвігі, натхняюць і клічуць іх да барацьбы і да новых перамог, умацоўваюць упэўненасць у канчатковым таржастве комунізма.

Геніяльныя творэнні В. І. Леніна і І. В. Сталіна атрымліваюць усё большае распаўсюджанне ў нашай краіне і ва ўсім свеце. На іх вучацца жыць, працаваць і перамагаць сотні мільёнаў людзей.

Таварыш Сталін на XIV з'ездзе партыі гаварыў: «Кадры нашы, і маладыя і старыя, растуць у ідэйных адносінах. Гэта наша шчасце, што нам удалося выпусціць некалькі выданняў твораў Леніна... Гэты факт з'яўляецца адной з асноўных гарантый таго, што са шляху ленінізма наша партыя не сыйдзе» (І. В. Сталін. Творы, том 7, стар. 342).

На пастанове і пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта нашай партыі ў пачатку мінулага года было завершана чацвертае выданне Твораў В. І. Леніна. Гэтае выданне, якое складаецца з 35 тамоў і выйшла паўмільённым тыражом на рускай мове, перакладзецца на мовы народаў нашай краіны і з'яўляецца неацанімай крыніцай ідэйнага выхавання і палітычнай загартоўкі нашых кадраў, невычарпальнай скарбніцай усеперамагаючых ідэй ленінізма.

Адначасова вялікімі тыражамі па рускай і на мовах іншых народаў нашай краіны выходзяць працы І. В. Сталіна— сцяганосца міру і шчасця народаў, геніяльнага прадаўжальніка справы В. І. Леніна. Агульны тыраж твораў Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна, выданых у нашай краіне за гады совецкай улады, складае 889 мільёнаў экземпляраў.

Ідэі ленінізма з'яўляюцца асновай выхавання совецкіх людзей у духу комунізма, бязмежнай любві да сваёй Радзімы, да партыі Леніна—Сталіна, якая вядзе наш народ да таржаства комунізма.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна ў краінах народнай дэмакратыі Еўропы і ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна выдаюць прагрэсіўныя выдавецтвы ва ўсіх краінах. Яны выданы на 117 мовах свету. Вялікія ідэі Леніна і Сталіна даходзяць да працоўных самых аддаленых куткоў зямнога шара. Ніякія перашкоды і забароны не могуць перашкодзіць пабеднаму шэсцю перадавых ідэй сучаснасці, ідэй ленінізма па ўсяму свету.

Няхай жыве ленінізм—усеперамагаючы сцяг вызвалення чалавецтва!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна—«розум, чэсць і сумленне нашай эпохі!»

Няхай жыве непераможны совецкі народ!

Пад сцягам Леніна, пад вадзіцельствам Сталіна—уперад, да новых перамог комунізма! **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Усе ўстаюць. Раздаюцца воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Вялікаму Сталіну—слава!», «Таварышу Сталіну — ура!», «Любімаму правадыру і настаўніку таварышу Сталіну — ура!». Прысутныя спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал». Зноў раздаюцца бурныя апладысменты і воклічы ў чэсць вялікага прадаўжальніка справы Леніна — таварыша І. В. Сталіна).**

Новыя творы ў карціннай галерэі

Камітэт па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР перадаў для папаўнення фонда Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР скульптурныя творы выдатнага майстра, заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР Н. Андрэева (1870—1924), які стварыў серыю партрэтаў генія чалавецтва В. І. Леніна. Андрэеўская Ленініяна, як вядома, была створана скульптарам у выніку глыбокага і непасрэднага вывучэння жыцця і рэволюцыйнай дзейнасці В. І. Леніна. Мастак назіраў правадыра за працай, у час гутарак з рабочымі і сялянамі, у час выступленняў. У музеі В. І. Леніна ў Маскве захоўваюцца малюнкі, зробленыя з натуры, з аўтографамі В. І. Леніна. Жывапісцы, скульптары і графікі, якім даводзілася працаваць над вобразам В. І. Леніна, заўсёды звяртаюцца да Ленініяны Андрэева, вучацца на творах выдатнага мастака не толькі пластычнаму майстэрству, але і раскрыццю глыбіні характару Владзіміра Ільіча.

Камітэт па справах мастацтва перадаў галерэі творы Н. Андрэева: «В. І. Ленін на трыбуне», «В. І. Ленін за кафедрай», «В. І. Ленін у крэсле», «В. І. Ленін на паседжанні», «В. І. Ленін слухае даклад» і другія.

Экспаніраванне твораў Н. Андрэева ў Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР дасць магчымасць гледачам бліжэй пазнаёміцца з майстэрствам скульптара.

Разам са скульптурамі Н. Андрэева ў фонды галерэі паступілі творы: лаўрэата Сталінскіх прэмій В. Мухінай — «Партрэт палкоўніка Юсупава», «Партрэт палкоўніка Хіжняка», лаўрэата Сталінскай прэміі Е. Вучэціча — «Партрэт В. Белінскага», І. Шадра — «Праект помніка А. Горкаму», «Партрэт мастака Н. Касаткіна», Ю. Падляскага — «Агні калгаснай ГЭС», В. Бялыніцкага-Бірулі — «Дні юнага мая», Ф. Мадорава — «Партрэт Героя Совецкага Саюза Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР В. Казлова».

П. ГЕРАСІМОВІЧ.

Твор пра барацьбу за мір

* М. КЛІМКОВІЧ *

Выйшла ў свет аповесць Уладзіміра Шахаўца «Насустрач». Аўтар не прэтэндуе на шырокі ахоп падзей і спыняе ўвагу чытача на параўнальна абмежаваным куточку партызанскай зямлі і на невялікім коле герояў. Гэта— тры падрыўнікі, або «чыгуначнікі», як іх з цёплым гумарам завуць партызаны: Салаўёў, Мажэйка і Джаліеў, дзве настаўніцы-разведчыцы: Святлана Мажэйка і Галіна Пятроўская, камісар брыгады Максімаў і камандзір атрада Ламко ды Пасця — нявеста Мажэйкі. Рэшта герояў больш-менш эпізадычныя. З іх запомніцца гаспадар штабной кватэры Клім Турок, старшыня калгаса Кастусь Серада, падпольшчык Іваноў, цётка Малання. Праўда, і з асноўных герояў не ўсе раскрыты ў належнай меры. Джаліеў, напрыклад, толькі «прысутнічае» пры больш актыўных таварышах, падтрымлівае іх размовы, удзельнічае ў аперацыях; Максімаў і Ламко, дазваляюць ці не дазваляюць тыя аперацыі, на якіх будуецца сюжэт, пасылаюць людзей на заданні, часам выступаюць з прамовамі, але ўвага на іх не сканцэнтравана, яны не паказаны ў цэнтры падзей.

Наогул кажучы, стройнага сюжэта ў аповесці няма, хоць малады пісьменнік імкнуўся да яго, і нават эпізадычныя героі, памянёныя ў пачатку аповесці (напрыклад, цётка Малання), завяршаюць свой лёс у канцы яе. Твор пабудаваны як ланцуг здарэнняў, якія адбываюцца то з адным, то з другім з герояў, і сціслым сюжэтам не звязаны.

Мары аб мірнай працы — гэта неад'емная рыса ў характарах герояў амаль усіх твораў на партызанскую і ваенную тэматыку. Клім — былы калгасны садоўнік і гароднік, — пасля размовы з Максімавым аб мірных днях, якія надыходзяць і да якіх трэба рыхтавацца, пачынае нібы па-новаму глядзець на свет. Доўга аглядае ён запушчаны і пакалечаны гітлераўцамі сад і бярэцца прывесці яго ў парадак. Яшчэ большую актыўнасць развівае Кастусь Серада, былы брыгадзір, якога паставілі цяпер за старшыню калгаса, бо былога старшыню, бацьку Пятра Мажэйкі і свёкра Святланы, гітлераўцы закатавалі яшчэ ў пачатку вайны, як совецкага патрыёта. Кастусь становіцца нібы памочнікам камандзіра атрада па сельскагаспадарчай частцы, аднаўляе калгас задоўга да вызвалення ад акупацыі, адкопвае схаваны ў пачатку вайны трактар і трымае яго ў баявой гатоўнасці. Былая настаўніца Святлана з вялікім запалам бярэцца за аднаўленне школы, а дзеці пачынаюць вучобу. Карціны працы трактара і першага дня ў школе — самыя лепшыя ў аповесці. Яны даюць магчымасць пісьменніку паказаць імкненні совецкіх людзей да мірнай стваральнай працы. Карціны абрываюцца паказам перашкод, якія сталі на шляху да поўнага раскрыцця гэтых якасцей совецкага чалавека ў той час: працы трактара перашкаджае варожы самалёт, а школу бамбіць цэлае звяно гітлераўскіх сцервятнікаў. Але нішто ўжо не здолее спыніць рух народа насустрач мірнай працы. У раскрыцці іменна гэтага — галоўная ўдача аповесці.

У аповесці нямала ўдалых і па-новаму выпісаных эпізодаў з ваеннага партызанскага побыту: адыход «чыгуначнікаў» пасля ўзрыву поезда; эпізод з мінай, на якой узарваўся начальнік будаўніцтва варожых акопаў; сцэна чытання звароту беларусаў—байцоў Совецкай Арміі і сцэна прысягі маладых партызан, якую слухае партызан Пятро Мажэйка. Гэтыя сцэны напісаны сціслa і сурова; яны хвалююць чытача сваім унутраным напружаннем.

Найбольш поўна выпісаны вобраз Святланы Мажэйкі. Варта прыгадаць тое месца ў аповесці, дзе расказваецца, як Святлана ганарыцца тым, што яна жыхарка Масквы. Чытаючы аповесць, верыш, што гэтае ўсведамленне надае ёй сілу перанесці самыя цяжкія пакуты ў турме. Поўна і разнастайна перададзены пачуцці Святланы ў час першага ўроку ў школе.

Нядрэнна карыстаецца У. Шахавец і мастацкай дэталлю. Праўда, часамі маладому празаіку здраджвае пачуццё меры і тады дэталь пачынае «абыгрывацца» так доўга і з такім націскам, што перастае служыць сваёй мэце. Так, на маю думку, здарылася з пчалой у самым пачатку аповесці. Аднаго палёту яе хапіла на цэлую калонку размовы трох падрыўнікоў, і чытачу становіцца зусім ясна, што гэтая дэталь ужыта хутчэй для аўтарскіх сентэнцый у канцы ўсёй размовы, чымся для паўнаты пейзажнай карціны і абставін адпачынку падрыўнікоў.

Трэба адзначыць імкненне пісьменніка зрабіць сваю мову простай і выразнай.

Аднак мова герояў, пры ўсёй розніцы ў іх узросце і характарах, амаль поўнасцю зліваецца з мовай аўтара: тая самая манера ў пабудове фразы, тая-ж лексіка. Здараецца часамі, што аўтар злоўжывае аднолькавымі займеннікамі: «Неўзабаве **яна** атрымала ад Сяргея пісьмо. Прачытаўшы **яго**, Святлана доўга глядзела на подпіс, потым пацалавала **яго**». Бывае і так, што, імкнучыся ўсё-ж прыдаць характэрнасць мове асобных герояў, аўтар прымушае іх гаварыць занадта кніжна і ўжываць не ўласцівыя беларускай мове звароты: «Пасля ўсяго перажытага вамі, няхопіць хладнакроўя, вытрымкі, каб надаваць выгляд, што вы зусім безуважлівая да ўсёй свалаты, якая сабралася там».

Адзначаныя недахопы не вызначаюць агульны ўзровень аповесці, але на іх аўтару трэба звярнуць увагу, каб пераадолець у сваёй далейшай працы.

Ул. Шахавец, «Насустрач», аповесць. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1951 год. Рэдактар — Н. Татур.

Завочнікі індустрыяльнага інстытута



Завочнікі—рабочыя аўтазавода на лабараторных занятках па супраціўленню матэрыялаў. Фота І. Салавейчыка.

Расце ўзровень совецкага рабочага класа. Тысячы рабочых павышаюць сваю агульную і спецыяльную адукацыю на завочных аддзяленнях ВНУ і тэхнікумаў. Шырокае развіццё завочнага навучання адыгрывае важную ролю ў вырашэнні адной з асноўных задач комуністычнага будаўніцтва: знішчэння супрацьлегласці паміж фізічнай і разумовай працай. Наглядным прыкладам можа служыць работа і вучоба студэнтаў Мінскага аддзялення Ленінградскага завочнага індустрыяльнага інстытута.

Аддзяленне арганізавана ў 1949 годзе. У той час тут налічвалася 57 студэнтаў. Зараз на трох курсах аддзялення займаецца 247 чалавек. У большасці гэта рабочыя мінскіх прамысловых прадпрыемстваў. Ім створаны ўсе ўмовы для паспяховага авалодання ведамі.

Да чытання лекцый і правядзення лабараторных заняткаў прыцягнуты вопытныя выкладчыкі універсітэта, політэхнічнага і юрыдычнага інстытутаў дацэнты Базылёў, Собалеў, Грузных, Шыдлоўскі і другія.

Лабараторныя заняткі па агульнай хіміі, фізіцы, супраціўленні матэрыялаў і электратэхніцы праводзяцца ў добра абсталяваных лабараторыях Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна і Беларускага політэхнічнага інстытута імя Сталіна.

Зараз у студэнтаў-завочнікаў паспяхова праходзіць зімовая экзаменацыйная сесія.

Вучоба завочнікаў цесна звязана з іх непасрэднай вытворчай работай. Набытыя веды і кансультацыі вучоных дапамаглі завочнікам укараніць у вытворчасць рад каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў.

Завочнік-комуніст Галынскі ўнёс дванаццаць рацыяналізатарскіх прапаноў, большасць з якіх прынята. Ажыццяўленне гэтых прапаноў дае 25 тысяч рублёў гадавой эканоміі.

Пад кіраўніцтвам студэнта-завочніка тав. Кантуша ў Белсельэлектра распрацоўваецца праект гідраэлектрастанцыі.

Выдатнік вучобы тэхнік электратэхнічнага завода тав. Матусаў сканструяваў універсальную падушку для штампаў, што дае значную эканомію металу. Ён зрабіў таксама прыстасаванне для нарэзкі шліфтоў да галоўкі вінта. Раней гэтая работа выконвалася ўручную.

Многія студэнты-завочнікі вылучаюцца на прадпрыемствах на адказныя ўчасткі работы, пераводзяцца ў разрад інжынерна-тэхнічных работнікаў. Рабочы Мінскага аўтазавода тав. Крукаў пасля заканчэння другога курса быў вылучан на пасаду тэхніка. Тэхнік Махонін (МАЗ) прызначан на пасаду інжынера.

Велізарныя магчымасці для развіцця сваіх здольнасцей, для няспыннага ўдасканалення і росту прадастаўлены чалавеку ў нашай краіне. Перад кожным совецкім чалавекам — шырокая дарога працы і творчасці.

А. СОЛАЎ.

Рэспубліканскі агляд дасягненняў творчай моладзі

Упраўленне па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР і ЦК ЛКСМБ намецілі правесці ў лютым — красавіку рэспубліканскі агляд творчасці маладых актораў, рэжысёраў, тэатральных мастакоў, музыкантаў-выканаўцаў.

У аглядзе прыме ўдзел моладзь тэатра оперы і балета, драматычных тэатраў, філармоніі і Белдзяржэстрады.

Агляд будзе праведзены трыма турамі. У першым туры будуць паказаны дасягненні творчай моладзі тэатраў і канцэртных арганізацый.

У другім туры, які адбудзецца з 15 сакавіка па 10 красавіка, будуць прагледжаны лепшыя работы маладых актораў.

Трэці тур — заключны канцэрт пры ўдзеле лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі — будзе наладжаны ў Мінску 23 — 24 красавіка. 25 красавіка арганізуецца рэспубліканская творчая канферэнцыя па абмеркаванню вынікаў агляду.

Для кіраўніцтва рэспубліканскім аглядам маладых талентаў створана камісія пад старшынствам начальніка Упраўлення па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР П. Лютаровіча.

У склад камісіі ўваходзяць народныя артысты СССР і БССР Л. Александроўская, Г. Глебаў, П. Малчанаў, народныя артысты рэспублікі І. Ждановіч, А. Нікалаева, М. Дзянісаў, К. Саннікаў, народныя мастакі І. Ахрэмчык, С. Нікалаеў, галоўныя рэжысёры тэатраў, мастацкія кіраўнікі філармоніі і эстрады, сакратар ЦК ЛКСМБ В. Позняк, галоўны дырыжор тэатра оперы і балета Л. Любімаў, кампазітар Ул. Алоўнікаў і другія.

Тэкст у дакументальным кінафільме

* Мікола САДКОВІЧ *

Цікавасць совецкіх людзей да велічных дасягненняў нашай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, жыцця нацыянальных рэспублік, стварэння велізарных збудаванняў, да сталінскага плана пераўтварэння прыроды, барацьбы совецкіх людзей за мір ва ўсім свеце абумовіла шырокае развіццё новага жанра ў кіно, жанра дакументальнага фільма, які адлюстроўвае характэр нашага жыцця, без непатрэбных выдумак і ўпрыгожанняў. У выніку сумленнай працы кінааператара, рэжысёра і пісьменніка з'явілася вялікая колькасць твораў, якія апавядаюць аб новых з'явах жыцця з выключным хваляваннем і шчырай праўдзівасцю.

Ні ў якай меры не прыніжаючы значэння ігравых кінафільмаў, трэба памятаць аб высокай выхаваўчай ролі дакументальнага жанра.

Павышэнне якасці беларускіх дакументальных кінакарцін, больш глыбокае пранікненне ў жыццё рэспублікі — першачарговая задача не толькі работнікаў кінастудыі «Беларусьфільм», але і ўсіх тых пісьменнікаў, якія прымаюць удзел у стварэнні фільмаў. У дакументальным фільме ў першую чаргу пісьменнік, як сцэнарыст, як аўтар дае напрамак усёй здымачнай групе.

Другім этапам работы пісьменніка ў дакументальным фільме з'яўляецца дыктарскі тэкст. Слова, якое дапамагае раскрыццю зрокавага вобраза, дапаўняе яго. Правільны, добра напісаны тэкст можа значна павысіць эмацыянальнае гучанне дакументальнага фільма, узмацніць яго пазнавальнасць, больш дакладна пракласці шлях ад экрана да сэрца гледача.

Ад тэкста залежыць поспех фільма. Дрэнны і неахайны тэкст можа сапсаваць нават вельмі добры фільм. Вось чаму на аўтару дыктарскага тэкста ў дакументальным фільме ляжыць вельмі вялікая адказнасць.

Асноўнае прызначэнне тэкста — нартыйна накіраваная інтэрпрэтацыя з'яў, якія адлюстраваны на экране, раскрыццё ідэйнага зместу карціны. Тэкст павінен каментыраваць кінакадр, даваць пазнавальныя дадзеныя, абагульняць факты рэчаіснасці. Але каментыраваць і абагульняць можна па-рознаму. Калі тэкст, каментыруючы, носіць толькі інфармацыйны характар, то апрача нездавальнення гледача, ён нічога не выклікае. Тэкст павінен інфармаваць так, каб за гэтай інфармацыяй раскрываліся дадзеныя, якія ўзбагачаюць кінакадр, спрыяюць пашырэнню культурна-палітычнага ўзроўню гледача.

У каляровым дакументальным фільме «Совецкая Беларусь» (гал. рэж. В. Корш-Саблін, сцэнарый Б. Губарэвіча), які толькі нядаўна закончаны вытворчасцю на студыі «Беларусьфільм», ёсць невялікі эпізод, які паказвае канвеер па Мінскім аўтазаводзе. Канвеер паказаны даволі падрабязна, і, здавалася-б, аўтару тэкста няма патрэбы прыходзіць на дапамогу кінакадру. І ўсё-ж тэкст узбагаціў і ўзмацніў гэты эпізод. Адбылося яно таму, што аўтар не проста праінфармаваў: «Гэта канвеер...», а паведаміў тое, чаго не мог бачыць глядач. Сказаўшы аб тым, што «гэта — палурунак роднай Масквы, гордасць аўтазавода» і што «раней гэтую работу выконвалі 40 рабочых на 21 варштаце, цяпер усяго чатыры майстры становяцца ля канвеера і праз некалькі мінут галоўка блока гатовая», аўтар значна пашырыў эпізод. У гэтым тэксце не ўсе словы адпавядаюць канкрэтным кінакадрам на экране, што ў дадзеным выпадку і не патрабуецца, але паведамляюць неабходныя пазнавальныя дадзеныя.

Процілеглым прыкладам можа служыць нядаўна прачытаны па студыі тэкст пры афармленні часопіса «Навіны дня». У адным з сюжэтаў часопіса была паказана калгасная птушкаферма. Тэкст да гэтага сюжэта быў прапанаваны такі: «Птушкаферма... куры-легторны. Знатная птушніца Марфа. Калгас выконвае пастанову аб развіцці жывёлагадоўлі». Кожнаму зразумела, што такі тэкст не дапамагае, а замінае кінакадру.

На жаль, яшчэ часта даводзіцца чуць заявы аб тым, што рэдактарскі аловак нібы выкрэслівае перш за ўсё жывое, характэрнае мастацкага слова. Гэта глыбока няправільнае ўяўленне вынікае з недакладнага разумення своеасаблівасці слова ў кінафільме. Тэксты многіх нашых аўтараў шматслоўныя, што нецярпіма ў дакладным і рэальным мастацтве дакументальнага кінематографа. Нярэдка даводзіцца сустракацца з трафарэтнымі, шаблоннымі выразамі. А між тым, іменна ў дакументальным кіно неабходна найбольш эканомна выявіць думку. Здольнасць знайсці эканомнае слова, асабліва каштоўна для аўтара дыктарскага тэкста. Часцей за ўсё гэта якасць праяўляецца ў выніку правільнага супрацоўніцтва пісьменніка і рэжысёра. Дакладна знойдзеная фраза і месца для яе заўсёды прыводзяць да поспеха. Цікава, што часта нават звычайная, ужо знаёмая нам фраза, трапна «пакладзеная на кадр», набывае высокае эмацыянальнае гучанне. У дакументальным фільме «Берлін» чатыры разы паўтараецца адзін і той-жа сказ: «Узняць сцяг перамогі над рэйхстагам». Ва ўсім вялікім эпізодзе, апрача гэтай фразы, няма ніводнага слова. Уздзеянне на гледача аказалася беспамылковым, моцным. Як гэта зроблена? Фраза: «Узняць сцяг перамогі над рэйхстагам» першы раз прагучэла на кадрах бою яшчэ ўдалі ад рэйхстага, прагучэла як задача, што пастаўлена перад войскамі фронта. Далей, узмацняючы кадры бою, узнімаючы рытм агульнага гучання, дыктар паўтарае знаёмую фразу ўжо як загад, патрабавальна, настойліва. Байцы ўварваліся па шырокія ступені рэйхстага, жорсткі бой ідзе за кожны выступ, за кожную калону. Падаюць забітыя, прыгнуўшыся, бяжыць па лесвіцы салдат са сцягам. Дыктар, нібы падбадзёрваючы яго, у трэці раз гаворыць: «Узняць сцяг перамогі над рэйхстагам»! Бой заканчваецца перамогай. Трэск аўтаматаў і кулямётаў змяняе ўрачыстая музыка. Героі ўзнімаюць сцяг над купалам рэйхстага. Моцны і цяпер урачысты голас дыктара абвяшчае:

«Сцяг перамогі ўзняты над рэйхстагам». Велічна і цудоўна прагучалі гэтыя словы.

Тэкст дазваляе рабіць вялікія палітычныя абагульненні, нярэдка па-новаму асэнсоўваючы, здавалася-б, звычайныя ўжо кадры. Часам аўтары дыктарскіх тэкстаў дакументальных фільмаў імкнуцца абавязкова здзівіць гледача, паведаміць яму нешта сенсацыйнае, забываючы пра неабходнасць дакладнай сувязі слова з кадрам. Такая тэндэнцыя часцей за ўсё прыводзіць да фальшы. Тэкст дакументальнага фільма не толькі не выключае, але, наадварот, абавязкова прадугледжвае эмацыянальнасць, вобразнасць слова. Вобразнасць-жа слова павінна яднацца з вобразам кадра, які звычайна з'яўляецца дакументальна дакладным. Так званыя мастацкія вольнасці шкодныя для фільма таксама як і зношаныя, шаблонныя словы, узятыя напракат з сухога газетнага артыкула. Жывы, эканомны і яркі тэкст не можа быць без гумару. У беларускіх дакументальных фільмах, на жаль, ён бывае вельмі рэдка.

Добрым прыкладам жывога слова могуць служыць некаторыя мясціны тэкста да фільма «Калгас «Рассвет» (аўтар М. Паслядовіч, рэжысёр А. Зархі). У эпізодзе, што апавядае аб вучобе калгасных дзяцей, паказаны ад'езд студэнтаў-калгаснікаў. Бацькі і маткі, малодшыя браты і сёстры развітваюцца са студэнтамі. Звычайныя пацалункі, абдымкі, прывітальныя словы. Тэкст паведамляе аб тым, куды накіроўваюцца студэнты, аб тым, што пры развітанні было выказана многа добрых пажаданняў і... ужо на кадры маленькае дзіця, якое плача: «...і шмат было праліта слёз». У гэтым выпадку ў вясёлай і радаснай сцэне ад'езду на вучобу, слёзы маленькага і фраза, якая тут сказана, толькі ўзмацняе агульны жыццерадасны настрой. І далей, коратка паведамляючы аб будучых прафесіях маладых калгаснікаў, «будучыя ўрачы, мастакі...» у момант з'яўлення на экране класа, у якім першы раз хлопчык на лічэбніку вучыцца лічыць да дзесяці, тэкст паведамляе: «...і будучыя матэматыкі». Тут тэкст не толькі паказаў нам новую калгасную інтэлігенцыю, але і выклікаў сяброўскую ўсмешку гледача, сцвердзіў тым самым сардэчныя цёплыя адносіны да паказанага на экране.

Пісьменнік — аўтар дыктарскага тэкста — суаўтар усяго кінатвора. Ён актыўна ўплывае на развіццё драматургіі фільма, дапамагае раскрыццю яго ідэі. Своеасаблівасць драматургічнай пабудовы дакументальнага фільма, у адрозненне ад ігравога фільма, выклікае некаторыя асаблівасці работы пісьменніка, як аўтара сцэнарыя і дыктарскага тэкста. Перш за ўсё, аўтар тут больш, чым у другіх выпадках, павінен добра вывучыць жыццё і тую тэму, якой прысвечаны фільм. Не маючы іншых выяўленчых сродкаў, апрача заснятай аператарам фактычнай падзеі (без актораў, без дэкарацый і інш.) і свайго слова, ён павінен знайсці прыём нарастання сюжэта і да канца трымаць цікавасць гледача. Праявы непатрэбнага пафасу, неапраўданай патэтыкі, шматслоўе, неадпаведнасць тэкста кадрам немінуча разбураюць адчуванне дакументальнасці, праўды і псуюць фільм.

Пісьменнік, які стварае тэкст да дакументальнага фільма, павінен заўсёды памятаць аб гледачу, ведаць яго патрабаванні.

Паміж словамі і кінакадрам у дакументальным фільме павінна быць актыўная сувязь, узаемадзеянне, якое дае гледачу магчымасць хутка, выразна ўбачыць галоўнае, убачыць у дэталі тое, што падкрэслівае агульную заканамернасць.

Не толькі ўвесь дакументальны фільм, у стварэнні якога прымае ўдзел вялікая колькасць людзей, але і дыктарскі тэкст у нейкай меры з'яўляецца вынікам калектыўнай працы, дзе вядучая роля належыць пісьменніку.

Немагчыма напісаць добры дыктарскі тэкст у адрыве ад працэса мантажа фільма, ад рэжысёра і яго матэрыяла. Найбольш правільная работа над дыктарскім тэкстам прадугледжвае ўдзел аўтара ў рабоце рэжысёра яшчэ ў працэсе чарнавога мантажа і ўдзел рэжысёра ў рабоце аўтара пры яго першым «чарнавым» апісанні кінакадраў.

Не менш важны тут і ўдзел рэдактара, які, валодаючы вопытам і пэўнымі ведамі, павінен дапамагчы аўтару заўважыць няўдалыя мясціны тэкста, зрабіць іх у спалучэнні з кадрамі найбольш даходлівымі.

Вельмі важна звярнуць увагу і на тое, як тэкст, нават удала напісаны аўтарам, даносіцца гледачу дыктарам. Нярэдка манера чытання дыктара прыніжае добры тэкст, робіць яго недаходлівым і фальшывым. Дыктар павінен чула ставіцца да слова ў кіно. Для яго не ў меншай ступені, чым для аўтара, патрэбна прастата, шчырасць і дакументальная дакладнасць. Залішняя прыўзнятасць, «акторскія» інтанацыі могуць стаць прычынай грубай памылкі нават пры наяўнасці добрага тэкста.

Жадаючы расказаць аб асноўных і галоўных момантах пабудовы тэкста ў дакументальным фільме, мы мелі на ўвазе, што развіццё беларускай кінематаграфіі праходзіць і будзе праходзіць у далейшым па двух напрамках — мастацка-ігравых і дакументальных фільмаў. Дакументальныя фільмы, як новы від совецкага кінамастацтва, што заваявала заслужаную любоў совецкага гледача, будуць усямерна развівацца і ўдасканальвацца. Пісьменнікі Совецкай Беларусі павінны прыняць самы актыўны ўдзел у павышэнні іх мастацкай і ідэйна-палітычнай якасці.

Павысіць узровень музычнай творчасці

(На сходах партыйнай арганізацыі Саюза кампазітараў і кампазітараў Мінска)

Адбыўся сход партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх кампазітараў БССР, на якім абмеркавана дзейнасць саюза і становішча музычнай творчасці ў рэспубліцы ў сувязі з заканчэннем работы пятага пленума ССК СССР і крытычнымі выступленнямі цэнтральнага і рэспубліканскага друку па гэтых пытаннях.

З дакладам аб выніках работы беларускіх кампазітараў за мінулы год выступіў музыказнаўца Б. Смольскі.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел кампазітары: Ул. Алоўнікаў, Р. Пукст, М. Аладаў, Д. Лукас і Я. Цікоцкі, адказны сакратар ССК БССР тав. Яржэмбіцкі, дырэктар музфонда тав. Хасдан, тав. Арлова (Мінскі ГК КП(б)Б).

Выступаючыя адзначылі, што беларускія кампазітары за апошні час напісалі рад удалых твораў, сярод якіх асабліва вызначаюцца чацвертая сімфонія (сімфонія працы) Пукста, віяланчэльная саната А. Багатырова, скрыпічная саната Д. Камінскага, некаторыя песні В. Яфімава, Ул. Алоўнікава, М. Аладава, П. Падкавырава, Р. Галавасцікава, Ю. Семянякі, апрацоўкі народных песень М. Чуркіна, Я. Цікоцкага і другіх.

Разам з тым было падкрэслена адставанне творчасці прафесіянальных кампазітараў ад узросшых запатрабаванняў совецкага слухача. Майстэрства кампазітараў усё яшчэ не на высокім узроўні. Зусім мала напісана ва ўсіх жанрах змястоўных твораў на велічныя тэмы нашай сучаснасці. У рабоце над новай операй («Песня аб шчасці» Д. Лукаса па лібрэта М. Клімковіча) не ўлічана крытыка цэнтральнага партыйнага друку оперы Жукоўскага «Ад усяго сэрца».

У песнях Д. Лукаса з года ў год вандруюць аднолькавыя інтанацыі і папеўкі. У працы некаторых кампазітараў адчуваецца паспешлівасць (сюіта для аркестра народных інструментаў Я. Цікоцкага), пасіўнасць і няўвага да сучаснай тэматыкі (А. Багатыроў). Ёсць няўдалыя песні («Песня аб маладых будаўніках Мінска», «Песня пра Гастэлу» Ул. Алоўнікава і другія).

Кампазітары Л. Абеліёвіч і М. Аладаў павінны пераадолець рэшткі фармалістычных уплываў, якія адчуваюцца яшчэ ў асобных творах.

Адной з важнейшых прычын нездавальняючага становішча музычнай творчасці ў рэспубліцы з'яўляецца прафесіянальная бездапаможнасць і беспрынцыповасць музычнай крытыкі, якая без пачуцця меры захвальвае або беспадстаўна ганіць новыя творы. Секцыя музыказнаўства Саюза кампазітараў (старшыня І. Нісневіч) па сутнасці бяздзейнічае.

Ва ўсіх выступленнях была адзначана неабходнасць аздараўлення творчай атмасферы ў саюзе, разгортвання прынцыповай крытыкі і самакрытыкі, дыскусій па асноўных праблемах развіцця беларускай совецкай музыкі, пераадолення абыватальскай нецярпімасці да крытыкі і групавых настрояў сярод асобных кампазітараў.

Была звернута ўвага на важнасць узмацнення дапамогі сталых майстроў самадзейным кампазітарам, большага зблі-жэння іх з саюзам, на неабходнасць ліквідаваць штучную адасобленасць кампазітарскага аддзялення кансерваторыі ад калектыва кампазітараў-прафесіяналаў.

Правільна ацаніўшы нездавальняючую работу філармоніі і Белдзяржэстрады ў галіне прапаганды беларускай музыкі, сход партарганізацыі вызначыў меры для палепшання гэтай справы.

Надзвычай важнай задачай Саюза кампазітараў з'яўляецца сталае азнаямленне членаў саюза з выдатнымі ўзорамі класікі, вывучэнне майстэрства кампазітараў братніх рэспублік і калектыўнае абмеркаванне кожнага новага твора беларускіх кампазітараў. У гэтых мэтах у новым клубе саюза будуць кожны тыдзень праводзіцца музычныя вечары.

Рэзкая крытыка была накіравана ў адрас Дзяржаўнага выдавецтва БССР, якое выдае мала твораў беларускіх кампазітараў, і «Саюздруку», які зусім не клапоціцца аб іх распаўсюджванні сярод шматлікіх харавых калектываў рэспублікі.

На сходзе партыйнай арганізацыі было таксама падкрэслена, што адным з галоўных метадаў павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню беларускай музыкі з'яўляецца марксісцка-ленінская вучоба ўсіх кампазітараў; на жаль, яна яшчэ не зусім добра наладжана.

Агульны сход партарганізацыі прызнаў правільнымі крытычныя артыкулы аб дзейнасці Саюза кампазітараў у газетах «Советская Белоруссия», «Советское искусство» і «Літаратура і мастацтва».

* * *

24—25 студзеня адбыўся агульны сход кампазітараў Мінска, прысвечаны рабоце пятага пленума ССК СССР і задачам беларускіх кампазітараў на 1952 год.

Даклад аб рабоце пленума зрабіў старшыня Саюза кампазітараў Я. Цікоцкі. Аб становішчы крытыкі і музыказнаўства паведаміў І. Нісневіч.

Па дакладу выступілі кампазітары Д. Камінскі, Ул. Алоўнікаў, Р. Пукст, В. Белы, М. Аладаў, паэт А. Русак, мастацкі кіраўнік філармоніі Б. Афанасьеў, мастацкі кіраўнік Белдзяржэстрады Дняпроўскі, музыказнаўцы Г. Цітовіч і Б. Смольскі, народная артыстка рэспублікі Р. Млодзік, драматург Я. Рамановіч, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага ГК КП(б)Б тав. Кузьмін, начальнік Упраўлення па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР тав. Лютаровіч і другія.

На агульным сходзе абмеркавана становішча музычнай творчасці ў рэспубліцы. Вызначаны меры ў галіне карэннай перабудовы работы саюза, палепшання творчай дзейнасці кампазітараў і музыказнаўцаў, набліжэння іх да жыцця. Асаблівая ўвага звернута на неабходнасць сістэматычнай прапаганды твораў беларускіх кампазітараў канцэртнымі арганізацыямі і перабудовы работы музычнай рэдакцыі Дзяржаўнага выдавецтва БССР.

У асобных выступленнях (тт. Белы, Камінскі, Алоўнікаў, Афанасьеў і другія) былі зроблены заўвагі адносна хібаў у артыкулах па пытаннях музыкі, якія друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва». Рэдакцыя ўлічыць прынцыповую крытыку і зробіць з яе канкрэтныя вывады.



Выступленне танцавальнай групы ансамбля кітайскіх артыстаў у Мінску. Танец з шоўкам.

Фота І. Салавейчыка.

Мы іх віталі, як родных

«З краіны ў краіну па горных вяршынях», — лунае крылатая, гордая песня— натхнёны гімн вялікай любасці да Чалавека, імя якога стала сімвалам міру, свабоды і шчасця.

У цяжкай, падняволь ной працы спявалі гэтую песню і рыкша, і кулі; у жорсткай барацьбе за перамогу народнай справы спяваў яе салдат Мао Цзе-дуна і Чжу Дэ.

І нам было лягчэй, нам было радасна ад гэтай думкі. Мы разам з імі верылі ў прыход запаветнага дня вызвалення, якое, нарэшце, прышло і да іх.

Любімую песню пра Сталіна спявалі ў Мінску ўчарашнія рыкшы і кулі, удзельнікі баёў за новы, народны Кітай, баявыя сябры гераічных салдатаў Карэі.

І радасць мінчан злівалася з радасцю нашых мілых кітайскіх сяброў.

Слова «мілых» само міжвольна вышла з-пад майго пяра. І я не хачу замяняць яго іншым. Іменна так: маладыя, сціплыя, мілыя — нашы госці прынеслі нам з родных прастораў свае мілагучныя, шчырыя песні, свае крыштальна чыстыя пачуцці дружбы.

Праходзяць дні, а ўсё яшчэ, як жывая, яе ў душы іх непаўторная па сваёй прыгажосці песня, усё яшчэ віраць перад вачыма бела-зялёна-чырвоныя колеры імклівага танца з шоўкам, усё ніяк не стрымаць захаплення майстэрствам трох выканаўцаў балетнай сцэны «На скрыжаванні».

Праходзяць дні, а ў сэрцы яшчэ не суняўся хвалюючы, цёплы сум расставання.

Мы іх віталі, як родных, з якімі даўно і вельмі хацелі спаткацца. Як родным, мы паказвалі ім свой адроджаны, індустрыяльны Мінск, сваю працу і песню. Мы разлучаліся з імі, як з роднымі, якіх заўсёды хочаш бачыць побач з сабой, разам жыць, працаваць і змагацца.

Гэта — пачуцці вялікай, агульнай радасці. Гэта—свядомасць вялікай, агульнай сілы. Гэта — залог нашай цудоўнай агульнай будучыні.

Прывітанне табе ад душы, наш магутны і сціплы, таленавіты ў працы і мужны ў змаганні кітайскі брат!

Янка БРЫЛЬ.

Наладзіць кніжны гандаль

Зусім нездавальняюча наладжан кніжны гандаль у Магілёўскай вобласці. Буйнейшы раённы цэнтр Клімавічы не мае добра абсталяванага кніжнага магазіна. У магазіне пад шыльдай «Кнігі» гандлююць і іншымі таварамі.

Але горш за ўсё тое, што спіс кніг, якія ёсць у продажы, не можа задаволіць пакупнікоў. Нельга знайсці ў магазіне «Жніво» Г. Нікалаевай, «Мар'ю» Медынскага, «Ад усяго сэрца» Е. Мальцава, «Мінскі напрамак» І. Мележа, «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча, «Пад мірным небам» А. Стаховіча.

Склад кніжнага магазіна — дашчатая будка з дзіравым дахам. Усё лета і восень тут ляжала кніг на 20 тысяч рублёў. Многа кніг папсавалася. Загадчыка склада тав. Шура гэта не турбуе. Спакойна сябе адчувае і старшыня Клімавіцкага райспажыўсаюза тав. Абраменка. Яшчэ ў мінулым годзе работнікі абласнога аддзела кнігагандлю абяцалі пабудаваць новы склад і культмаг. Але справа далей абяцання не пайшла.

Кніжны гандаль у Клімавічах вядзецца без ведання справы. У магазіне ёсць пяты том твораў Н. В. Гогаля, трэці том твораў Ф. Гладкова, а папярэднія тамы ляжаць на складзе. Прадаўцы не ведаюць, што ёсць у магазіне. Паводле іх сцверджання, у магазіне няма твораў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, А. Куляшова. Між тым, кнігі гэтыя ляжаць у звязках нераспячатанымі.

Не лепш абстаіць справа з кніжным гандлем і ў другіх населеных пунктах вобласці. Мілаславіцкі сельмаг мае кніг усяго толькі на 237 рублёў. Загадчык сельмага Чэмісава не імкнецца завезці ў магазін новыя кнігі. У сельскіх магазінах Родні, Судзіл, Галіч, Малашкавіч няма мастацкай літаратуры. Старшыня Раднянскага сельпо тав. Несцярэнка не клапоціцца аб кніжным гандлі.

У гор. Касцюковічы зусім няма кніжнага магазіна або хаця-б кіёска. Нельга тут знайсці твораў Мічурына, Лысенкі, Вільямса, кніг па садоўніцтву і пчалярству — усяго таго, што карыстаецца вялікім попытам сярод калгаснікаў.

Не лепш абстаіць справа ў Чырвонаполлі, Слаўгарадзе, Хоцімску. У магазінах буйных сёл Хоцімскага раёна Ельні, Бярозак, Забялышан, Трасціна няма ніводнай кнігі. Старшыня Хоцімскага райспажыўсаюза тав. Букініч не цікавіцца кніжным гандлем.

Распаўсюджванне кнігі — важная дзяржаўная справа. Рэспубліканскаму «Кнігагандлю» трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на гандаль кнігамі ў раёнах, гарадах і сельскай мясцовасці.

(Наш кар.).

Безуважнасць да рэжысуры

Пасля пачатку новага сезону абласныя тэатры рэспублікі паставілі ўжо некалькі новых спектакляў. Адзін з лепшых спектакляў Гродзенскага тэатра — п'еса «Гэтых дзён не змоўкне слава» Л. Рудога (пастаноўка рэжысёра І. Стасенкі).

П'еса Л. Рудога «Гэтых дзён не змоўкне слава» адлюстроўвае слаўныя старонкі гераічнай барацьбы нашага народа за совецкую ўладу на Далёкім Усходзе, якой кіраваў ваенна-рэволюцыйны штаб большэвікоў на чале з легендарным камандзірам прыморскіх партызан Сяргеем Лазо. Галоўная якасць п'есы — ў жыццёвых, праўдзівых вобразах. Любоўна выпісана аўтарам сцэна ў тайзе, а таксама сцэна на канспіратыўнай кватэры Лазо, у якой партызан дзядзя Міця расказвае аб сваёй незабыўнай сустрэчы з В. І. Леніным і І. В. Сталіным. Шчыра праводзіць гэтую сцэну артыст Н. Анісімаў, які ў вобразе дзядзі Міці раскрыў суровы воблік героя, яго цёплую бацькоўскую ўсмешку, нянавісць да ворагаў рэволюцыі і любоў да народа.

Вобраз слаўнага камандзіра далёкаўсходніх партызан Лазо, на вялікі жаль, не знайшоў належнага сцэнічнага ўвасаблення ў выкананні Шляхціна. Нягледзячы на асобныя ўдалыя сцэны (успаміны Лазо аб сваёй маленькай дачцы, мары аб кнігах, аб комуністычным заўтра), сцэнічны вобраз у цэлым атрымаўся даволі бледны. Больш перакананча праводзіць актор фінальную сцэну на мітынгу. Тут ужо адчуваецца голас Лазо — голас большэвіка-трыбуна.

Рамантычны вобраз партызанкі-падпольшчыцы Машы стварыла артыстка В. Панкрат. На добрым прафесіянальным узроўні праводзяць свае ролі артысты Н. Кімберг і Ю. Сідараў. Заслугоўвае ўвагі работа В. Уласава над эпізадычнай роллю казака.

Поспех спектакля «Гэтых дзён не змоўкне слава» быў-бы значна большым, калі-б яго рэжысёрская работа стаяла на больш высокім ідэйным узроўні і адпавядала творчым магчымасцям калектыва тэатра. Невыразна акрэслена рэжысёрам лінія гераічнай барацьбы совецкага народа пад кіраўніцтвам вялікіх правадыроў Леніна і Сталіна за совецкую ўладу на Далёкім Усходзе. Гэта прывяло да няправільнай трактоўкі асобных сцэн спектакля. Рэжысёр у некаторых карцінах сышоў з рэалістычных пазіцый і захапіўся меладрамай.

Не знайшоў І. Стасенка разам з мастаком В. Горскім і вобраза мастацкага афармлення спектакля. Нестае ў спектаклі музыкі. А колькі ў гэтай п'есе цудоўнага паэтычнага матэрыялу для ўзнёслай гераічнай музыкі!

Вялікім недахопам спектакля з'яўляецца адсутнасць ансамбля, невыразнасць масавых сцэн, у якіх адсутнічае сапраўдны пульс жыцця.

Толькі лёгкадумнымі адносінамі да складання рэпертуара тэатра можна вытлумачыць той факт, што на сцэну яго трапіла заганная, выпадковая п'еса «Нараджэнне сенатара». Гэтая п'еса «зроблена» аўтарамі па ўсіх правілах французскай меладрамы, у цэнтры якой стаіць вядомы канфлікт паміж мужам, жонкай і любоўнікам. А каб ад гэтага канфлікта не так ужо аддавала нафталінам, аўтары перасыпалі яго сучаснымі праблемамі—барацьбой за сенатарскі партфель на выбарах у адным з штатаў Паўднёвай Амерыкі, у часе якой «высокародны» любоўнік Хэрра Томас — гаспадар тэкстыльных фабрык — здымае сваю кандыдатуру ў карысць чэснага мужа, плантатара Эверы Смал.

Не абыйшлося тут і без негрыцянскай экзотыкі. Праўда, у п'есе ёсць і паўстанне рабочых-неграў, але яно адбываецца за сцэнай, і мы чуем толькі яго далёкі невыразны гул. У п'есе няма галоўнага—сапраўднага голасу прагрэсіўных сіл амерыканскага народа, які змагаецца за мір і дэмакратыю, за свабоду і чалавечую годнасць неграў, за спыненне крывавай вайны супраць свабодалюбівага гераічнага карэйскага народа. Ясна, што на матэрыяле такой п'есы тэатр не здолеў стварыць спектакль, які хваляваў-бы нашага гледача.

Недаацэньваюць рэжысёры і работы над словам. Гэта асабліва адчуваецца ў класічных спектаклях. Некаторыя нашы акторы забываюць, што слова з'яўляецца галоўнай зброяй актора ў яго рабоце над вобразам, праз якую ён выяўляе ідэю, думкі і пачуцці свайго героя. Якая багатая мова ў класікаў рускай літаратуры — Астроўскага, Чэхава, Горкага і як часамі бедна яна гучаць са сцэны нашых тэатраў, у прыватнасці, Гродзенскага тэатра.

Зараз усё больш настойліва паўстае пытанне аб выхаванні маладых кадраў рэжысёраў. І сапраўды, каго з маладых рэжысёраў выхаваў Гродзенскі тэатр за апошнія гады? Нікога.

Час падумаць тэатральнаму інстытуту аб выхаванні рэжысёраў для беларускіх тэатраў. Рэжысуры нашых абласных тэатраў неабходна дапамога. У гэтай дапамозе асаблівую патрэбу адчувае Гродзенскі тэатр, у якім за апошні сезон змяніліся тры галоўныя рэжысёры. Гэты тэатр неабходна ўмацаваць сталай высокакваліфікаванай рэжысурай, якая здольна будзе выхоўваць ансамбль, весці выхаваўчую работу ў калектыве.

Ул. СТЭЛЬМАХ.

Абласная выстаўка самадзейнага мастацтва

Выстаўка твораў выяўленчага мастацтва самадзейных мастакоў Полацкай вобласці, якая адкрыта ў кінатэатры «Радзіма», прыцягнула ўвагу грамадскасці і працоўных горада Полацка. Самадзейныя мастакі вобласці прышлі да справаздачнай выстаўкі з некаторымі прыкметнымі поспехамі. Значна ўзмацнілася іх творчая актыўнасць і ўзрасло майстэрства. Лепшыя творы жывапісу, графікі, мастацкай вышыўкі, разьбы па дрэву прысвечаны вобразам В. І. Леніна і І. В. Сталіна, вялікім будоўлям комунізма, аднаўленню і добраўпарадкаванню роднага горада.

Перш за ўсё хочацца сказаць аб карцінах, якія адлюстроўваюць вобразы В. І. Леніна і І. В. Сталіна і новабудоўлі комунізма. Заслугоўвае ўвагі карціна «Рапарты з вялікіх будоўляў комунізма» — кампазіцыйны партрэт таварыша Сталіна, напісаны мастаком К. Маеўскім. Мастак — рэзчык па дрэву В. Шышкіноў у сваіх барэльефах В. І. Леніна і І. В. Сталіна паказаў добрыя здольнасці і майстэрства разьбы па дрэву. Хвалюе гледача невялікая па памерах карціна маладога мастака В. Азаркова «Беларускі лес — новабудоўлям комунізма». Сюжэт гэтага твора вельмі лаканічны: пуцявы абходчык-чыгуначнік прапускае нагружаны першагатунковым беларускім лесам чыгуначны састаў, які ідзе на адну з вялікіх будоўляў комунізма. Уся карціна напісана ў светлых святочных танах.

Творчыя замыслы мастакоў звернуты да сучаснай совецкай рэчаіснасці. Мастак К. Маеўскі напісаў два акварэльныя партрэты перадавікоў сельскай гаспадаркі: кампазіцыйны партрэт Героя Социялістычнай Працы, старшыні калгаса імя Молатава Глыбокаўскага раёна Лытысавы і партрэт Героя Социялістычнай Працы, намесніка старшыні калгаса «Расоны» Расонскага раёна Гарэцкай. Акварэльныя эцюды К. Маеўскага адлюстроўваюць мірную стваральную працу па аднаўленню і развіццю прамысловасці сельскай гаспадаркі, аднаўленню і добраўпарадкаванню палачанамі свайго роднага горада. Выстаўка выявіла яшчэ двух несумненна здольных маладых мастакоў: І. Дуліна, які напісаў тэматычную карціну «Стрэл у лесе» і В. Багачова — аўтара партрэта «Суворава».

На выстаўцы вялікае месца займаюць экспанаты мастацкай вышыўкі. Значнага майстэрства ў мастацкай вышыўцы дасягнулі майстры мастацкай вышыўкі А. Падчотная, В. Пасталоўская, Е. Пушкіна, Е. Барэйша, В. Полух, А. Савіцкая, Л. Бяляева, Л. Мурава і многія другія.

Выстаўка самадзейнага выяўленчага мастацтва твораў майстроў народнай творчасці 1951 года паказала значныя творчыя дасягненні самадзейных мастакоў вобласці.

А. ШАТРОЎ.

г. Полацк.

У дэмакратычнай Польшчы

★

Міхась ЛЫНЬКОЎ

★

Я не спыняюся на аналізе ўсіх прыведзеных твораў. Самі назвы іх гавораць аб пэўных тэндэнцыях і ідэйных напрамках лепшых твораў польскай літаратуры.

Сярод атрымаўшых розныя прэміі—калектыў вучоных інстытута літаратурных даследванняў, узнагароджаны за ўвядзенне марксісцкіх метадаў у літаратурна-даследчай працы, таленавіты калектыў ансамбля песні і танца Мазоўшэ. Атрымалі прэміі і паасобныя тэатральныя калектывы: Дзяржаўнага камернага тэатра Варшавы (за пастаноўку п'есы Сцяфана Жэромскага «Грэх»), Дзяржаўнага польскага тэатра ў Варшаве (за пастаноўку п'есы Грыбаедава «Гора ад розуму») і Дзяржаўнага новага тэатра ў Лодзі (за пастаноўку «Педагагічнай паэмы» Макарэнкі і п'есы Вармінскага «Перамога»).

Сярод лаўрэатаў мы знаходзім таксама імёны вядомых музыкантаў, выканаўцаў, дзеячоў тэатральнага мастацтва.

Сеймам краіны зацверджаны незадоўга да гадавіны Кастрычніка Статут Акадэміі навук Польшчы. Безумоўна, гэта дапаможа значна палепшыць працу навуковых устаноў, перабудаваць усю навуковую дзейнасць у адпаведнасці з узросшымі запатрабаваннямі народа, з задачамі социялістычнай перабудовы краіны, пастаўіць навуку на сапраўдную службу народу.

Багата зроблена ў сучаснай Польшчы па ліквідацыі непісьменнасці (па-польску — ліквідацыя анальфабетызму), гэтага страшнейшага перажытка старой капіталістычнай Польшчы.

У адпаведнасці з запатрабаваннямі часу перабудоўваюць сваю работу польскія школы, універсітэты і розныя іншыя культурныя ўстановы і арганізацыі: музеі, клубы, бібліятэкі і г. д.

5. Расце і мацнее дружба народаў

Велізарная аднаўленчая праца польскага народа, будаўніцтва буйнейшых прадпрыемстваў, уся гіганцкая работа па ажыццяўленню шасцігадовага плана будаўніцтва і социялістычнага пераўтварэння краіны праходзіць пры братняй падтрымцы і дапамозе совецкага народа. Совецкія машыны, станкі і ўсемагчымае тэхнічнае абсталяванне вы знойдзеце на аўтамабільных заводах, на верфях, на будаўніцтве такіх гігантаў, як Новая Гута, на шахтах і рудніках Сілезіі, на тэкстыльных фабрыках Лодзі, на аднаўленчых і будаўнічых работах у Варшаве і ўсюды і ўсюды. Совецкія трактары, камбайны і іншыя сельскагаспадарчыя машыны працуюць на палях кааператыўных і дзяржаўных гаспадарак, папаўняюць паркі польскіх машынна-трактарных станцый.

Буйнейшыя совецкія спецыялісты дапамагаюць праектаваць новыя прадпрыемствы, будаваць іх і наладжваць выпуск першай прадукцыі.

З гэтай вялікай братняй дапамогай польскі народ, упершыню ўзяўшы свой лёс у свае ўласныя рукі, дабіваецца буйнейшых перамог у справе перабудовы ўсяго жыцця, у будаўніцтве новай, социялістычнай Польшчы, у рашучым павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню шырокіх працоўных мас краіны. Польскія працоўныя пераймаюць найбагатшы вопыт совецкага народа ў будаўніцтве социялізма, вучацца ў нашага народа, асвойваюць яго перадавыя метады працы. Польскі народ высока ацэньвае нашу братнюю дапамогу, надае выключнае значэнне сваёй дружбе з совецкім народам. І на ўсіх сходах, мітынгах і сустрэчах, на якіх нам даводзілася пабываць як у горадзе, так і ў вёсцы, першым і апошнім словам кожнага выступаўшага з прамовамі, з прывітаннямі было слова аб дружбе, слова глыбокай падзякі совецкім людзям, якія не толькі выратавалі польскі народ ад смяротнай фашысцкай небяспекі, але і дапамаглі ім назаўсёды вызваліцца ад нямецкіх і польскіх паноў, адкрылі шлях да новага жыцця, да новай будучыні.

Колькі ўсхваляваных прамоў, прачулых слоў сказана было ў адрас таварыша Сталіна, у якім польскі працоўны бачыць свайго найлепшага друга, свайго збаўцу, свайго абаронцу і настаўніка. Нельга было без хвалявання слухаць простыя словы сялянкі Скорэк Станіславы:

— Прашу вас, вельмі прашу, перадайце навечную падзяку ад мяне і ад майго сына таварышу Сталіну. Яго салдаты выратавалі нас ад смерці. Совецкія людзі дапамаглі нам знайсці сапраўднае шчасце ў жыцці, радасць нашым дзецям. Яшчэ і яшчэ раз прашу вас перадаць нашу сардэчную падзяку таварышу Сталіну!

Тысячы і тысячы такіх гарачых просьбаў выслухалі мы ад рабочых, ад сялян, ад польскай моладзі, ад дзяцей.

Польска-совецкая дружба расце і мацнее з кожным днём. Аб гэтым гаворыць і рост папулярнасці і аўтарытэту такой масавай грамадскай арганізацыі ў Польшчы, як Таварыства польска-совецкай дружбы. Некалькі год таму назад гэтае Таварыства мела каля шасцідзесяці тысяч сваіх членаў. На сённешні дзень у Таварыстве аб'яднана каля чатырох з паловай мільёнаў чалавек. Арганізацыя праводзіць вялікую работу па азнаямленню працоўных Польшчы з жыццём совецкіх людзей, з іх працоўнымі поспехамі і перамогамі, з характарам социялістычнага будаўніцтва, з асаблівасцямі нашага дзяржаўнага і грамадскага жыцця, з Кастрычніцкай рэволюцыяй, з совецкай эканомікай і культурай, з паслядоўнай мірнай палітыкай Совецкага ўрада і г. д. Таварыствам арганізаваны шматлікія курсы па вывучэнню рускай мовы. Курсы, лекцыі, даклады, выданне спецыяльнай літаратуры, часопіса «Дружба», наладжванне выставак совецкай кнігі, фестываляў совецкіх кінафільмаў — вось далёка няпоўны пералік той адказнай і ўдзячнай работы, якую праводзіць Таварыства па паглыбленню дружбы нашых слаўных народаў. Зразумела, што гэтая работа праводзіцца і ўсімі іншымі арганізацыямі: партыйнымі, дзяржаўнымі, кааператыўнымі, сялянскімі і маладзёжнымі.

Сённешняя польская рэчаіснасць, настроі польскіх людзей, іх адносіны да совецкага народа гавораць аб тым, што іменна ў нашы гады споўніліся запаветныя мары двух выдатных сыноў народа — Пушкіна і Міцкевіча — аб тым светлым часе, калі «народы, распри позабыв, в великую семью соединятся».

Польскі народ назаўсёды ўвайшоў у слаўную сям'ю свабодалюбівых народаў, якія будуюць новае жыццё, змагаюцца за сапраўдную дэмакратыю, за мір і бяспеку для ўсіх народаў.

Справе міру прысвячае польскі народ свае працоўныя подзвігі, здабыткі сваёй стваральнай працы. Эмблему міру — сілуэт голуба — вы сустрэнеце ўсюды: і на плакатах і лозунгах, і на станках, і на будцы паравознага машыніста, і ў каюце карабля, і на сценах клуба, і на дзвярах кватэры.

Мы бачылі, як у дзяржаўнай гаспадарцы Осава Сень рабочыя замянялі эмблему фашысцкага арла, што красаваўся на сцяне былога баронскага замка, на эмблему голуба.

— Нам не па дарозе з гэтай кіпцюрыстай жабай!

Так называлі яны фашысцкага арла, так называлі яны фашызм.

Польскі народ рашуча ліквідуе ўсякія перажыткі старой санацыйнай Польшчы. Закасаўшы рукавы, ён будуе новую, социялістычную Польшчу. Будуе разумна, смела, на вякі. Будуе з вялікім уздымам, з сапраўдным энтузіязмам. Тыя, каму аказалася не па дарозе з народам, былі выкінуты за межы краіны. Мікалайчыкі і ім падобныя апынуліся на сметніках гісторыі. Гэтымі сметнікамі, праўда, ліхаманкава займаюцца розныя трумэны. Але сметнікі застаюцца сметнікамі, і гісторыя не ведала яшчэ такіх выпадкаў, каб эксплаатацыя сметнікаў давала-б якія-небудзь рэальныя прыбыткі. Гэтую простую ісціну варта-б ужо ўразумець і розным трумэнам.

Пажадаем-жа польскаму народу поспехаў і ўдачы ў яго гераічнай працы, у яго змаганні за сваю будучыню!

Заканчэнне. Пачатак гл. у №№ 51, 52 за 1951 г. і ў №№ 1, 2 і 3 за 1952 г.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Аляксей КУЛАКОЎСКІ, Пімен ПАНЧАНКА (намеснік галоўнага рэдактара).

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 74373. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэволюцыйная, 12. —1